ВЫДАННЕ АСВЕТНІКАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Настаўніцкая газета

Выходзіць з 20 снежня 1945 года | №78 (4436) СЕРАДА, 28 верасня 1994 года | Кошт па падпісцы — 8 руб., у розніцу — 30 руб.

ДУМЫ НАСТАЎНІКА

СПОВЕДЗЬ

Не выстудзі чалавечае

Некалі быў народны жарт: "Каб пражыць у шчасці, трэба красці, красці!" Зараз гэты жарт ператварыўся ў сур'ёзную і бадай што адзіную "мудрасць" жыцця.

З намі, нашымі дзецьмі адбываецца такое падзенне, якое можа стаць незваротным. З чалавечага сметніку вылезці амаль немагчыма. Катастрофу назад не адкруціш, як кінастужку.

Калі народ даведзены да стану, што ад яго, як ад драпежнікаў, ахоўваюць калгасныя палі атрады міліцыі — гэта страшна. Я не пазнаю свой народ. Мы губляем сваё аблічча. Мы губляем — сябе.

Бо мы былі зусім іншыя. Давайце ўзгадаем кожны свой род. Колькі годнасці, чалавечай прыгажосці было ў ім.

Бабулька мая, Ксенія, вучыла нас, дзяцей, з пялёнак (як самай найгалоўнай) мудрасці: "Нават калі знойдзеш нешта на дарозе — у дом не нясі. Ад чужога — бяда будзе. Нехта ж згубіў, плакаў. Чужыя слёзы — слязамі і выльюцца. Бяжы адразу, пытайся — чыё. Нясі чалавеку."

Народу не патрэбна была гульня ў прыгожыя словы, у высакароднасць — тут гаварыла мудрасць народная, набытая стагоддзямі.

У прабабкі маёй было 13 дзяцей: 12 дзяўчынак і хлопчык. Не баяліся нашы дзяды і прадзеды цяжкасцяў — карміць жа трэба, апранаць. Каб баяліся, як мы, дык і нас не было б. І гордыя былі!

Прабабка, простая сялянка, адмовілася сваёй пані ручку пацалаваць. Хаця многія лічылі гэта за свой ганаровы абавязак...

— Цалуй руку, быдла! — крычала яснавяльможная.

Прабабка адказала, што пані сама — быдла.

Паклікалі гайдукоў. Тыя засеклі прабабку на вачах усёй вёскі. Кроў горлам пайшла — і засталіся 13 сірот, сярод іх мая бабулька, Ксенія.

Не было ў яе нічога — ні бялізны, ні каровы, ні манет у панчосе, ні долараў з маркамі. Было ёй — 6 год. Пабегла з дому, калі бацька прывёз мачаху з 6 душамі. Гнаўся прадзед за Ксеніяй у люты мароз. Прабегла па тонкаму льду. Бацьку слабы лёд не пусціў, прымусіў спыніць пагоню. Дабегла бабулька да нямецкіх хутароў.

Сцямнела. У двор не зайсці — сабакі. Лягла пад агароджай і заснула. Думала, назаўсёды. Выйшаў гаспадар, каб сябак супакоіць, а на зямлі — змерзлае дзіця. Верую чая душа не магла дапусціць граха — унёс у хату, адагрэў. Засталася бабулька ў няньках.

Грымнула рэвалюцыя, пазвалі ў камсамол, грамаце вывучылася. Выбілася ў людзі. Выйшла замуж за добрага, але хворага чалавека. Як ні старалася, ні аддавала апошняе, выратаваць не ўдалося. Зноў засталася адна з дачкой, з маёй маці.

Так яно — бяда за бядой. І ніяк няшчасці і цяжкасці не маглі выстудзіць у чалавека — чалавечае. У Айчынную вайну бабулька хавала, рызыкуючы жыццём, у сваім пограбе яўрэяў і афіцэрскіх жонак. Неяк немцы прыйшлі з сабакамі — данеслі "добрыя" людзі. Загрукаталі прыкладамі.

Выручыла... мова. З годнасцю абурылася на чыстай нямецкай — як можна дазваляць так паводзіць сябе? Адкуль ведаю мову? Выхоўвалася ў дастойнай нямецкай сям'і. Дачку хаваю? Дачка ад сухотаў памерла, паглядзіце на партрэт у чорнай рамцы. Спалохаліся сухотаў, пайшлі.

Хутка і нашы прыйшлі. Тата, танкіст, вызваляў горад і сустрэў маю маці. Убачыў прыгожую дзяўчыну, скочыў з брані.

Затым — пасляваенны голад. Людзі падалі каля сметнікаў. Перасхалі ў Мар'іну Горку, дзе я і нарадзілася. Добрыя людзі з шэрымі, спакутаванымі тварамі. Чэргі, чэргі. "Уставай, дзіцятка, а то не дадуць на цябе макароны!" — будзілі малую ў 6 гадзін раніцы.

Памёр Сталін. Строем плакалі каля помніка. Потым быў Хрушчоў з чэргамі за хлебам. Брэжнеў — са штучным дэфіцытам на ўсё і з культам прадаўцоў. Потым — пустыя паліцы перабудовы. Узбагачэнне зладзеяў і спекулянтаў. Палка каўбасы — у чвэрць зарплаты сапраўднага працаўніка.

Вось я і думаю: чаму мае бабулькі, цёткі і дзядзькі не беглі ў Канаду ці Францыю — калі было цяжка? Чаму ўпрагаліся і выцягвалі — сям'ю, заводы і калгасы?

Не адпачывалі не толькі на Гаваях ці Канарах, наогул не адпачывалі. І не праклінаді радзіму, не смяяліся над зямлёй бацькоў, не клялі з іх за тое, што яны не накралі за сваё жыццё.

Прабабка палічыла ніжэй за чалавечае званне цалаваць ручку сваёй (дык — сваёй жа!) пані.

А зараз... Неяк ад годнасці нашай застаецца толькі пусты гук. А, значыць, — ад нас... Сумна.

Ну нельга ж — цягнуць руку за лыжкай сурагату да тых, хто нас рабуе. Нельга вазіць сваіх дзяцей у чужыя сем'і, каб падкармілі. Няўжо незразумела? Жабрацтва — гэта стан душы. Жабрацтва і пачынаецца — з жабрацтва душы.

Не, сын, я не суправаць, каб ты паехаў за мяжу. Але хачу, каб ты паехаў як прадстаўнік паважаючай сябе нацыі. Каб мы ганарыліся табой. Каб на цябе там глядзелі, як на выдатнага спецыяліста з Беларусі, без якога не могуць абысціся.

Калі ты гэта зразумееш, калі твае аднагодкі зразумеюць жыццё сваіх бацькоў і дзядоў, тады нацыя будзе жыць. І тады — хай нам зайздросцяць.

А пакуль нам не да Гаваяў. Брыдка ад тэлезакліканняў паехаць туды, ну іх! Будзем цярпець і працаваць. На гэтым стаяла і стаіць зямля наша.

Таццяна КАРЭЛІНА,
настаўніца.

НЕ МАГУ ПАГАДЗІЦЦА

Дзядуля Крылоў папярэджваў...

Татальнае рэфарматарства апошнім часам захлюпнула і асвету і асветнікаў, не абышла такі гэтая чаша і такую традыцыйна кансерватыўную сферу жыцця як адукацыя. Замест звыклых "сярэдніх палітэхнічных", да якіх часам дадавалася "імя...", усё часцей з'яўляюцца гімназіі і ліцэі.

Натуральна, узнікае пытанне, чым адрозніваюцца яны ад звычайных школ, якія яшчэ захаваліся? Пытанне, на жаль, можа застацца рытарычным, калі не адкажам яшчэ на адно. Як жа карэнным чынам павінна была змяніцца яшчэ нядаўна ўсенародная адукацыя, каб жаданай явай сталі элітарныя школы? Напэўна, у нашай надзвычай усярэдненай адукацыі таілася інтэлектуальная эліта, якой было цеснавата ў агульнадаступнай і абавязковай сярэдняй і якой нарэшце прадастаўлены ўсе магчымасці для самавыяўлення. Мабыць, немалаважную ролю ў гэтым адыграла і наша педагагічная навука. Клапоцячыся аб перспектывах бесперапыннай адукацыі ад дзіцячага садка да самых вышэйшых яе ступеняў. І нашы гімназіі і ліцэі, якія ўжо неяк язык не паварочваецца назваць папросту школамі, будуць такім неабходным у гэтым ланцужку сувязным звяном паміж сярэдняй і вышэйшай адукацыяй.

Ну як не згадаць тут параду незабыўнага Казьмы Пруткова "не вярнуць вачам сваім"! Цікава, колькі б "панегірыкаў" было напісана ім з гэтай нагоды, каб ён быў нашым сучаснікам. Не выключана магчымасць, што вялікія нашы школьныя рэфарматары пазбавілі б яго сатырычнага дару ўвогуле. Бо сатыра, што бічуе асобныя негатыўныя праявы грамадскага жыцця, павінна абапірацца ўсё ж на станоўчыя пазіцыі. А калі агульны фон жыцця ўсе мокш кантрастуе з сатырычнымі адлюстраваннямі некаторых яго бакоў, то сатыра сама па сабе страчвае сэнс і ператвараецца ў прасторы татальнага абсурду. У нас такога роду кантраст робіцца ўсе мокш выразным, спіраецца грані паміж станцыямі грамадскага дабра і грамадскага зла.

Ці не па той жа прычыне ўсё больш непапулярнымі становяцца на эстрадзе нашы вядомыя сатырыкі? А навошта бываць на іх канцэртах, калі гэткія ж нумары, толькі яшчэ болей натуральныя і выразныя, выконваюцца скрозь: у кабінетах, за трыбунамі, за прылаўкамі...

І усё гэта, як на лахмусавай паперцы, выяўляецца ў мове, асабліва ў грамадска-палітычнай тэрміналогіі і фразеалогіі. Удумайцеся ў ходкі сярод палітыкаў выраз — "забяспечыць сацыяльную абарону маламаёмных слаёў насельніцтва".

Каго абараняюць — зразумела, ад каго абараняюць — можна здагадацца пры пэўным намаганні, ну а хто абаранае — ясней яснага. Вось і атрымліваецца, што абаронцы абараняюць абараняемых ад абараняючых, канкрэтней — ад саміх сябе. Пры гэтым абараняемыя заканамерна пазбаўлены магчымасці абараняцца самі, бо гэты клопат на сябе ўжо ўсклалі абаронцы.

Такому гратэскнаму каламбуру мог бы пазайздросціць нават сам Салтыкоў-Шчадрын. Ды і Ільф з Пятровым (памятаеце іх крылатую фразу "выратаванне тапельцаў — справа рук саміх тапельцаў") адчулі б, напэўна, сябе пасля знаёмства з гэтым выслоўем толькі пачаткоўцамі.

Абсурдныя словы ў нас гарманічна спалучаюцца з абсурднымі лічбамі. Вось толькі адна з іх, блізкая тэме публікацыі: за навуковую ступень кандыдата навук у нашай сістэме адукацыі, дзе бясконцы клопат аб інтэлектуальным развіцці грамадства ахапіў усіх школьных рэфарматараў, плоцяць кругленькую суму... У размеры адной мінімальнай зарплаты.

Але вернемся да нашых навучальных устаноў новага тыпу, сярод якіх апошнім часам ужо сустракаюцца нейкія сінтэзаваныя назвы: "школа-гімназія", "школа-ліцэй".

Паглядзім на гэты дзіўны педагагічны сімбіёз з моўнага пункту гледжання, паколькі ўжо мы адзначылі, што ў мове аб'ектыўнага фіксуюцца ўсе сацыяльныя казусы, трэба толькі ўмець чытаць. Дарэчы, пры ўсіх зменах у вышэйшай школе да вызначэння статуса навучальных устаноў вось такім чынам яшчэ не дайшлі, не сустракаюцца тут такія моўныя навацыі, як "інстытут-універсітэт", "універсітэт-акадэмія". Што датычыць падобных наватвораў у сярэдняй школе, дык хацелася б напомніць, што згодна з азначэннем тых жа рэфарматараў, гімназіі і ліцэі — гэта таксама школы, толькі новага тыпу. І атрымліваецца, што назва дзіўнай, мякка кажучы, навучальнай установы "школа-гімназія" выглядае пры адносна уважлівым чытанні так: "школа — школа новага тыпу". Магчыма, (што, відаць, і самае верагоднае) і такое прачытанне: "ні школа — ні гімназія", "ні школа — ні ліцэй", ні тое — ні сёе.

Вяртаемся, такім чынам, да выходных пытанняў нашай публікацыі, для адказу на якія недастаткова ўважліва чытання цыльды, нават з элементамі лінгваналізу. Неабходна на ўсё гэта паглядзець суадносна з праблемамі ўласна педагагічнымі, бо ў моўных дзіўнасцях (маюцца на ўвазе новыя найменні) як найлепш выяўляецца дух і літара сучаснага рэфарматарства ў адукацыі. Як лагічна і проста — усё вялікае вызначаецца прастатой — з пэўнай колькасці школ арганізаваць некалькі ліцэяў і гімназій. Збіраем вучняў з мінімальнай колькасцю непажаданых адзнак, папярэдне стварыўшы камісію па адбору, а можна і без яе, уводзім некалькі новых, часам проста экзатычных прадметаў — і навучальная ўстанова новага тыпу гатова. Тым больш, што пры нязначнай карэкціроўцы гэты "галавакружны" працэс адпавядае ідэям дэферэнцыяцыі навучання, так папулярным апошнім часам у педагогіцы.

Застаецца толькі шкадаваць, што жыватворная дыдактычная ідэя, у якой закладзена неабходнасць аптымальнага задавальнення творчых запатрабаванняў самых розных груп навучэнцаў, аказалася недарэчным чынам выпусташанай кан'юнктуршчыкамі і набыла змест, які характарызуецца адным словам — падзел. Магчыма, у многіх не хапіла цярпення чытаць у слоўніку далей пра значэнне слова "дыферэнцыяцыя". Як вядома, яны — многія — людзі занятыя, ім чытаць, а тым больш вывучаць штосьці няма калі. Уладаіўшы, што падзяляць трэба з такой жа руплівасцю, як калісьці "не пушчаць", яны і пачалі... Не-не, не падзяляць (як можна ў новы дэмакратычны час!), а дыферэнцыраваць на двоечнікаў і выдатнікаў, на дрэнных і добрых, на здольных (па іх меркаванні) і няздольных.

Ды вось скруха: сабраць усіх здольных у гімназіі і ліцэі аказалася на практыцы складаней, чым у тэорыі. Ды і тых гімназістаў і ліцэістаў, якія ўжо, так бы мовіць, адбыліся, трэба час ад часу падзяляць паўторна, бо не ўсе ж здольныя засвоіць у дадатак да абавязковай праграмы складаную гімназічную ці ліцэйскую (так і хочацца чамусьці сказаць "лицедейскую") даважку, якая складаецца з надзвычай неабходных і сапраўды актуальных прадметаў. А яшчэ розныя гурткі і факультатывы — галава кругам!

Вось і з'яўляюцца дзіўныя назвы: "школа-гімназія", "школа-ліцэй". Не выключана магчымасць, што нас яшчэ чакае не толькі выдзяленне асобных гімназічных класаў у школах, але і з'яўленне ў некаторых класах "гімназічных" вучняў: гэта будзе зусім паслядоўна ў працэсе сучаснага рэфарматарства.

Пры ўтварэнні такіх дваістых навучальных устаноў у іх канструктыўнымі сіламі закладваецца механізм абароны школьных рэформ ад дэструктыўных сіл. Усё тое, што падлягае крытыцы з боку дэструктыўных сіл пераводзіцца ў звычайныя класы, а тое, што адлюстроўвае рэфарматарскія намаганні канструктыўных сіл і што можна заўсёды прадэманстраваць, знаходзіцца ў гімназічных. Недастойных гімназістаў і ліцэістаў пастаянна можна перакідваць (пераводзіць) у класы звычайныя.

Застаецца толькі здзіўляцца бюракратычнай мудрасці.

А ці падлічыў хто-небудзь, які педагагічны, маральны і эканамічны ўрон наносіцца сістэме адукацыі? Як сябе адчуваюць вучні і бацькі, марна спрабуючы зразумець перавагу новых школ? А як настаўнікам пры такім дыферэнцыраванні? Пытанні, безумоўна, застаюцца без адказаў.

Падзел на здольных і ... не зусім здольных узмацняецца яшчэ і выдзяленнем так званых профільных класаў (матэматычных, эстэтычных, экалагічных і інш.) — наколькі каму дазваляе фантазія. Не так даўно давялося пачуць нават пра адкрыццё 5-х класаў эканамічнага профілю, што ўсяляе сур'ёзныя надзеі на эканамічны росквіт Рэспублікі Беларусь.

Натуральна, пры прафіляванні ўлічваецца не толькі паспяховасць — схільнасці вучняў вызначаюцца шляхам старанна прадуманага тэсціравання і прасочваюцца спецыяльнымі псіхолага-дыдактычнымі службамі на працягу цэлага шэрагу год, аж да паступлення пасля школы ў навучальныя ўстановы назначанага профілю. Канешне, усе так, інакш гэта прыводзіла б толькі да педагагічных і матэрыяльных выдаткаў.

Ад дэструктыўнай крытыкі і іранічнага тону асмелімся перайсці да канструктыўных парад, як патрабуюць таго законы жанру. У якасці найпершай парады дазволю сабе працытаваць дзядулю Крылова з уласным успаўненнем:

"Чтоб музыкантом быть,
Так надобно уменье" —
А не служебное лишь рвенье.
И в отношеньи всяческого рвенья
Пора бы поумерить пыл!

Далей і больш сур'ёзна неабходна: стрымана ставіцца да ўвядзення новых гімназічных прадметаў, а ўжо калі такія з'явіліся, то яны павінны сістэмна дапаўняць і паглыбляць абавязковы дзяржаўны кампанент адукацыі.

І яшчэ, арганічнае спалучэнне ўсіх прадметаў (новых і традыцыйных) у цэласную адукацыйную сістэму, каб пазбегнуць хаатычнага нагрувашчвання навучальных дысцыплін, магчыма толькі ў кантэксце развіццёвага навучання. Яго канцэпцыя, дастаткова поўна распрацаваная ў педагагічных даследаваннях, чамусьці ў асноўным так і засталася тэорыяй, і школы новага тыпу, на жаль, выключэння не склалі, нягледзячы на ўвесь творчы патэнцыял, закладзены ў дэталёва падрыхтаваных дакументах гімназій і ліцэяў. Звыклая схема "запамінанне, засваенне — узнаўленне" (загад, інструкцыя — выкананне) аказалася недасягальнай для ўсялякіх там канцэпцый і канцэптаў.

І нарэшце, у гэтых адносінах трэба зрабіць зусім мінімум: вызваліць настаўніка ад бюракратычнай увагі, але ўмацаваць дидактычны і метадычны ўплыў школьных кіраўнікоў. Гэта значыць — даць магчымасць гэтым кіраўнікам правяць сябе перш за ўсё ў якасці выкладчыкаў, бо вышэйшымі катэгорыямі ў свой час яны былі адзначаны не за адміністратыўныя доблесці, а за найлепшую работу ў выкладанні школьных прадметаў. А той факт, што ўсе школьныя кіраўніцтва з'яўляцца настаўнікамі вышэйшай катэгорыі, наўрад ці выклічэ ў нехага пярэчанні — і зразумела, чаму. І калі начальніцкія аўтарытэты замест "указующего перста", які вельмі часта абарочваецца для ўсіх нукіцкім, вымушаны будуць дэманстраваць уласныя дасягненні ў рабоце з навучэнцамі, тады, магчыма, не ўзнікне неабходнасць укараняць за ўжытак дзіўныя неалагізмы: "школа-ліцэй", "школа-гімназія".

На заканчэнне ўспамінаецца колішняе інтэрв'ю, якое даў маленькі гімназіст адной з правінцыяльных газет. На каварнае пытанне карэспандэнта, чым жа адрозніваецца іх гімназія ад звычайнай школы, з усёй непасрэднасцю і ўпэўнена кемлівы хлопчык адказваў, што ў іх шмат гурткоў і ўсялякіх секцый. Наколькі цяжка нешта дадаць да фінальнай рэплікі маленькага героя з даволі вядомай казкі Андэрсана пра голага караля, настолькі і гэта вычарпальнае і пераканаўчае тлумачэнне юнага гімназіста, а дакладней, прагімназіста, наўрад ці маглі б чым-небудзь дапоўніць нават самі стваральнікі школ новага тыпу.

Міхаіл ГРЫГАРКЕВІЧ,
настаўнік 1-й баранавіцкай школы.

А ВАША ДУМКА?

"Сама і рабі..."

Звяртаюся да вас быццам бы з прыватным пытаннем, але, думаецца, яно датычыцца не мяне адной, а многіх маіх калег.

А пытанне, якое мяне непакоіць, — гэта адносіны да французскай мовы. Апошнім часам намецілася яе яўнае скарачэнне не толькі ў школах. Нават выпускнікі школ з французскай мовай у ВНУ, тэхнікумах, іншых спецыяльных навучальных установах пачынаюць вывучаць у асноўным англійскую ці нямецкую мову.

Так, зараз і больш распаўсюджанай і таму больш модная стала англійская. Дык што, мова краіны вялікай культуры, выдатнейшых літаратуры і мастацтва Францыі ўжо зусім непатрэбная? Навошта ж тады ўвогуле наш і без таго скуднелы бюджэт выдаткоўваць яшчэ і на падрыхтоўку незапатрабаваных спецыялістаў і на выданне непатрэбных падручнікаў?

А цяпер пра асабістае.

Я працую настаўніцай французскай мовы ў сярэдняй школе №2 Новалукомля ўжо больш як 20 год. З мінулага навучальнага года ўсе пяцікласнікі пачалі вывучаць толькі англійскую мову, французскую ў школе вырашылі "выводзіць". Стаўка, праўда, у мяне пакуль што набіраецца, але гэта самыя слабыя па паспяховасці (некаторыя і па напаўняльнасці невялікія — нават на групы не дзеляцца!) класы.

Сёлета ў школе адкрываецца 1 клас з паглыбленым вывучэннем англійскай мовы. Бацькі ўсіх пяцікласнікаў напісалі заявы на вывучэнне англійскай. А як быць з французскай?

Адміністрацыя мне прапанавала ісці на бацькоўскія сходы і самой агітаваць за яе. Ці ж гэта метад?

Навучальныя планы дазваляюць з 6 класа вывучаць другую замежную мову, але я чую і ад калег, і ад бацькоў, што гэта залішняя нагрузка на вучняў і таму — немэтазгодна.

Крыўдна, канечне, і за сябе, але яшчэ больш крыўдна, што знікае з нашай адукацыйнай, а значыць і культурнай прасторы такі вялікі пласт агульначалавечай каштоўнасці. Іспанскую мову з яе, амаль што ўжо выключылі, цяпер — чарга французскай?!

А ёсць жа, напэўна, нейкія нарматыўныя дакументы, якія рэгулююць навучанне розным мовам. Дзе іх знайсці? Да каго звярнуцца, каб спытаць: чаму яны не выконваюцца?

І яшчэ. Ці толькі ў нашай школе такое становішча? І чаму ВНУ, ССНУ ажываюць французскую мову? А як абстаяць справы ў іншых школах? Хацелася б пачуць думку калег на гэты конт.

Нэлі КАЧАТКОВА,
настаўніца французскай мовы 2-й новалукомльскай школы.

Я МЯРКУЮ ТАК

Шэсцьдзесят пытанняў на засыпку

У мінулым навучальным годзе гісторыя ў 5 — 9 класах выкладалася па новых праграмах. Пераход на новы змест гістарычнай адукацыі ў 10 — 11 класах плануецца здзейсніць у наступным навучальным годзе. Параўнальна нядаўна праекты праграм па сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі для 10 — 11 класаў былі змешчаны ў "Настаўніцкай газеце". У іх адрас можна выказаць шмат заўваг. Перш за ўсё кідаецца ў вочы перагружанасць праграм фактычным матэрыялам. Так, у працэсе вывучэння толькі адной тэмы "Узнікненне Савецкай дзяржавы. Асноўныя тэндэнцыі яе развіцця (1917 — 1941)" (Усеагульная гісторыя, 11 клас) аўтары праграмы прапануюць разгледзець 60 пытанняў. Застаецца толькі гадаць, колькі пытанняў прапануецца вучням за ўвесь 11 клас і ў якой ступені выпускнікі змогуць засвоіць такі велізарны матэрыял.

Пры абмеркаванні канцэпцыі гістарычнай адукацыі яе аўтары сцвярджалі, што вывучэнне гісторыі ў 10 — 11 класах у адрозненне ад першай ступені навучання павінна адбывацца на больш высокай тэарэтычнай аснове. Аднак прасочым, як гэтыя пажаданні ажыццяўляюцца на практыцы. Для гэтага параўнаем назвы пытанняў і і II ступені.

І ступень: "Аб'яднанне краіны і ўтварэнне сёгуната Такугава. Характарыстыка сёгуната" (8 кл.), "Паўночная вайна. Стварэнне рэгулярнай армі і флоту, будаўніцтва гарадоў" (7 кл.), "Шматукладная гаспадарка. Развіццё фэадальных адносін" (6 кл., Гіст. Бел.), "Прымусовае ссяленне яўрэяў у гарады і мястэчкі" (8 кл., Гіст. Бел.).

II ступень: "Ізясу Такугава — выдатны аб'яднальнік краіны. Сістэма сёгуната" (10 кл.), "Пачатак Паўночнай вайны. Рэарганізацыя армі" (10 кл.), "Шматукладная гаспадарка і яе фэадалізацыя" (10 кл., Гіст. Бел.), "Прымусовае ссяленне яўрэяў у гарады і мястэчкі".

Не трэба быць вялікім спецыялістам-гісторыкам, каб заўважыць, што пералічаныя пытанні проста дублююць адно другое. Каб лепш паказаць недарэчнасць такой з'явы, можна прывесці наступную аналогію: уявіце сабе сітуацыю, калі б табліца множання вывучалася спачатку ў пачатковай школе, а потым у 10 або ў 11 класе. Большасць настаўнікаў назвала б гэта абсурдам. Вось і ўзнікае пытанне: навошта вывучаць адно і тое ж па два разы?

Добра вядома, што пытанні па вызначэнні дзяржаўнага ладу Расіі ў першай чвэрці XVIII ст. і ацэнкі дзейнасці Пятра І з'яўляюцца дыскусійнымі ў гістарычнай навуцы. На жаль, гэты момант не знайшоў адлюстравання ў праграме па сусветнай гісторыі.

У праграмах адсутнічае і накірунак на тэарэтычнае асэнсаванне кастрычніцкіх падзей 1917 года ў Расійскай Імперыі. Ніхто не заклікае спяваць дыфірамбы "мудраму народнаму выбару". Задача аўтараў праграм і падручнікаў заключаецца ў тым, каб з вышыні сучаснага развіцця гістарычных навук высветліць усе тэарэтычныя і рэальна магчымыя шляхі палітычна-грамадскага развіцця Расіі і Беларусі, паказаць, які ўплыў гэта аказала на гістарычнае развіццё народаў Расіі і свету.

Праграма па гісторыі Беларусі выглядае больш цікавай. Перш за ўсё гэта тлумачыцца імкненнем разглядаць гістарычныя працэсы, якія адбыліся на беларускай зямлі, у кантэксце еўрапейскай і сусветнай гісторыі.

Але нягледзячы на гэту навізну, можна заўважыць, што па-за ўвагай аўтараў засталіся суседнія краіны (Польшча, Украіна, Літва, Латвія, Эстонія). Пры разглядзе сярэднявечнай гісторыі Беларусі, на наш погляд, надрэнна было б закрануць і такія праблемныя пытанні, як "ВКЛ (Рэч Паспалітая) і праблема абсалютызму", "ВКЛ і знешнепалітычныя альтэрнатывы сярэдзіны XVII ст.", "ВКЛ і Расія: еўрапейская і азіяцкая мадэлі грамадскага ўладкавання", "ВКЛ: шлях ад адзінаўладдзя да саслоўна-прадстаўнічай манархіі і шляхецкай рэспублікі".

Неабавязкова, на нашу думку, так падрабязна спыняцца на падзеях першай сусветнай вайны. Даволі багаты фактычны матэрыял па гэтай тэме прапануецца ў курсе 8 класа. Увагу вучняў старэйшых класаў можна было б скіраваць на ўплыў першай сусветнай вайны на нацыянальна-вызваленчы і палітычны рух, на эканамічнае развіццё Беларусі.

Толькі пошук новых падыходаў у адносінах да гісторыі прынясе карысць настаўнікам і вучням.

Леанід ДЗЕКЦЯРОЎ,
настаўнік гісторыі Купішскай школы Браслаўскага раёна.

ПРАПАНУЕМ

Пашпарт здароўя? А чаму б і не!

Неабавязковы характар заняткаў фізкультурай і спортам ставіць пытанне аб эфектыўнасці розных праграм здароўя, комплексаў тыпу ГПА, усяго таго, што не мае прамога дачынення да патрэбнасцяў чалавека. А патрэбнасці, асабліва моладзі, часта фарміруюцца пад уплывам жаданняў. Таму і даводзіцца часам бачыць, як юнакі ці дзяўчаты ўжо ў 13—14 год курацъ і ўжываюць алкаголь. Піць ды курыць іх ніхто не прымушаў. Жаданне выглядаць дарослымі, пераймание не лепшых прыкладаў, падпарадкоўванне паводзін толькі сваёй волі, свайму "Я", дае падставу гаварыць аб адсутнасці моцных маральных асноў у грамадстве, якія накіроўвалі б моладзь у неабходным напрамку. Але той, хто даражыць жыццёвай пазіцыяй, заўсёды адпавядаючыя прыклады ў спорце. Тыя якасці, якія выхоўвае спорт, дапамагаюць не толькі фізічнай, але і псіхічнай загартоўцы чалавека і пераносяцца ў яго паўсядзённае жыццё, ствараючы стэрэатып дзеянняў. Вось чаму неабходны абавязковыя заняткі спортам!

Увага тэлегледачоў цэлы месяц была прыцягнута да чэмпіянату света па футболу ў Амерыцы. Радавала позірк шматлікасць гледачоў з розных краін на трыбунах стадыёнаў. Ці ж гаворыць гэта аб іх высокім узроўні авалодання фізічнай культурай? Толькі чалавек, які мае непасрэднае дачыненне да спорту, можа апанаць спаборніцтвы, і яны будуць прывабліваць яго. Артыстычная сувязь са спортам — гэта стыль жыцця. Да амерыканцаў ён прыйшоў праз неабходнасць вялікіх намаганняў у пошуку сродкаў да жыцця, у барацьбе за існаванне, што, натуральна, прывяло да больш уважнага повіраку на сваё здароўе. Таму зайсёды вядомыя яны аддаюць заняткам спортам. Здароны больш зробіць, быццам бы простая аксіёма, але ставіць яна саме заняткаў фізічнай культурай у плоскасць неабходнасці. У наш турботны час мы ідзём тым шляхам, які ўжо пройдзеным іншымі краінамі. Патрэбна пераняць найлепшы вопыт, што больш экзатычна, чым прарваць яго на сабе, стараючы небяспечную сітуацыю.

Падтрымка цела ў добрым стане абавязкова для прафесій, у якіх неабходна надзейнасць, хуткасць, добрая рэакцыя, псіхічная і фізічная трываласць. Гэтыя якасці неабходны таксама і вайскоўцам. Таму хлопцы павінны ісці ў армію ўжо добра фізічна падрыхтаваныя, каб маглі вытрымаць цяжкасці армейскай службы. Гэта можа здзейсніцца толькі са зменай адносін да фізкультуры і спорту ва ўсім грамадстве, з адраджэннем погляду на фізічнае выхаванне, як на стрыжнёвы момант у развіцці чалавека.

Кожнаму чалавеку трэба ведаць свае магчымасці, і гэтай мяце можа, на маю думку, паслужыць пашпарт здароўя, які накіроўваў бы чалавека па найбольш эфектыўнаму шляху развіцця яго фізічных магчымасцяў. Пашпарт мог бы адлюстроўваць адносіны чалавека да заняткаў фізічнай культурай, ступень яго падрыхтоўкі да працоўнай дзейнасці, неабходныя ўмовы ўдасканалення надзейнасці сістэм арганізма чалавека.

Працоўная дзейнасць павінна стаць рэгулятарам адносін чалавека да заняткаў фізічнай культурай і спортам на першым этапе, каб гэтыя заняткі сталі потым патрабаваннямі кожнага грамадзяніна краіны.

Але гэта пакуль што будучыня, якая залежыць ад агульнага культурнага ўзроўню грамадства. А зараз неабходна захаваць тое, што назапашана, стварыць новыя формы працы для развіцця фізкультуры і спорту, якія ўлічвалі б цяперашнія жаўлівыя і фарміравалі гуманны тып адносін паміж людзьмі.

Віктар КАЙДАЛАЎ,
трэнер па футболу СДзЮШАР №5 Брэста.

НГ-ІНФАРМ

10 тысяч новых сяброў "Настаўніцкай газеты"

Рэдакцыя атрымала папярэднія звесткі аб выніках падпіскі на чацвёрты квартал 1994 года. З першага кастрычніка ў чытацкай грамадзе "Настаўніцкай газеты" значнае папаўненне — прыбавілася дзесяць тысяч падпісчыкаў. Усяго "НГ" будзе выходзіць тыражом 50.008 экземпляраў (без уліку рознічнага продажу), што на дзесяць тысяч больш, чым у трэцім квартале. З цэнтральных перыядычных выданняў краіны, якія выдаюцца толькі на беларускай мове, па колькасці падпісчыкаў "НГ" на другім месцы пасля "Звязды".

Дзякуй усім, хто падтрымаў адзіную педагагічную газету нашай дзяржавы.

ВЕСТКІ

На гэтым тыдні ў нашай краіне "народзіцца" Беларуская акадэмія адукацыі — грамадская арганізацыя навукоўцаў.

* * *

У пасольстве ЗША ў Беларусі адбылася сустрэча з беларускімі вучнямі, якія год навучаліся ў Штатах.

* * *

Аздараўленчы цэнтр для дзяцей адкрыўся ў Вілейскім раёне.

* * *

У Брэсце па ініцыятыве аддзела гарвыканкама па рабоце з моладдзю і праваахоўнымі органамі створана асацыяцыя "Моладзь супраць злачыннасці".

* * *

У Асіповіцкі раён у новым навучальным годзе прыбылі 30 выпускнікоў Магілёўскага педінстытута, Беларускага дзяржуніверсітэта, Горацкага педвучылішча. Многія з іх — былыя вучні школ горада і раёна.

* * *

Дзіцячы ансамбль "Рознакаляровая гульня" сярэдняй школы №158 Мінска заняў другое месца на міжнародным фестывалі дзіцячай творчасці "Першацвет", які праходзіў у Бярдзянску (Украіна).

* * *

130 студэнтаў займаюцца на першым курсе Бабруйскага інстытута кіравання. Ён створаны на сродкі беларускіх прадпрымальнікаў.

* * *

Чацвёра студэнтаў-аспірантаў з Беларусі накіраваны на вучобу ў Кембрыджскі універсітэт. Гэта пераможцы ў конкурсе доследных праектаў, які штогод праводзіцца Кембрыджскім універсітэтам адной з самых прэстыжных ВНУ Вялікабрытаніі.

* * *

У Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы адкрыты факультэт замежных моў, дзе будзе праводзіцца падрыхтоўка па спецыяльнасці "Класічная філалогія".

Міхась АНІСЕНКА.

НАВІНЫ З ГОМЕЛЯ

СЯБРОЎСТВА ДАЕ ПЛЁН

Гарадская бібліятэка № 11 падтрымлівае трывалыя сувязі з навучальнымі ўстановамі горада. Тут арганізоўваюцца цікавыя выставы, сустрэчы з мясцовымі паэтамі, мастакамі, пісьменнікамі. Бібліятэку наведвае больш як 3600 чытачоў, сярод іх шмат школьнікаў.

ПРА АСАБЛІВАСЦІ ПРАГРАМ

Гарадскі метадычны цэнтр правёў семінары з настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры. Абмеркаваны асаблівасці праграм навучання, перавод школ на новы змест выкладання беларускай літаратуры.

МЕТАДЫЧНЫ ФЕСТЫВАЛЬ

праведзены з загадчыкамі і метадыстамі дашкольных устаноў абласнога цэнтра. Асноўнае пытанне дзелавой сустрэчы — псіхолага-педагагічныя аспекты супрацоўніцтва дзіцячага сада і сям'і.

Галіна АТРОШЧАНКА.

СВЕЖЫЯ ЧАСОПІСЫ

"НАРОДНАЯ АСВЕТА"

Вераснёўскі нумар часопіса адкрываецца рэдакцыйным артыкулам "Кіраванню школай — сучасны ўзровень". У ім асаблівая ўвага кіраўніцкіх органаў засяроджана на паглыбленні дэмакратычных асноў кіравання навучальнымі ўстановамі, абвешчаных Канстытуцыяй нашай дзяржавы і зафіксаваных у Законе "Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь".

Пад рубрыкай "Арганізацыя народнай адукацыі" надрукаваны артыкул члена бацькоўскага камітэта сярэдняй школы № 198 Мінска В.Нікольскага "Стыль работы райана: новыя падыходы", у якім гаворка вядзецца аб пошуках і знаходках Фрунзенскага аддзела адукацыі сталіцы па адраджэнню нацыянальнай сістэмы навучання і выхавання вучнёўскай моладзі.

Артыкул дацэнта кафедры сацыяльнай педагогікі і прафесіянальнага майстэрства Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта І.Цімашэнкі "Сацыяльны педагог: яго функцыі і поле дзейнасці" змешчаны пад рубрыкай "Пытанні педагогікі і псіхалогіі".

Рубрыка "Выхаваўчы працэс: тэорыя і практыка" прадстаўлена ў нумары артыкулам дэкана Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі У.Кабуша "Ліквідаванне аўтарытарызму ў дзейнасці педагога-выхавацеля і шляхі павышэння яго прафесіянальнай культуры" і гутаркай карэспандэнта часопіса з рэдактарам газеты "Раніца" І.Угальнік з нагоды 65-годдзя выдання для школьнікаў.

Пра асаблівасці праблемы сучаснай беларускай хімічнай тэрміналогіі разважае ў сваім артыкуле дацэнт кафедры неарганічнай хіміі Белдзяржуніверсітэта, кандыдат хімічных навук А.Васілеўская.

Улічваючы пачатак новага навучальнага года, у нумары шмат месца адведзена планаванню. Надрукаваны, у прыватнасці, праграма па фізіцы для 10-х класаў гуманітарнага профілю, падрыхтаваная настаўніцай гімназіі № 199 Мінска А.Ясковіч; планаванне па матэматыцы ў 9 — 12-х класах вячэрняй (зменнай) агульнаадукацыйнай школы, распрацаванае загадчыкам кабінета матэматыкі Віцебскага інстытута ўдасканалення настаўнікаў Д.Перлініым і настаўнікам матэматыкі сярэдняй школы № 4 Віцебска І.Кацняльсонам; а таксама заканчэнне каляндарна-тэматычнага плана па чарчэнню ў 7 — 8-х класах, складзенага настаўнікам чарчэння сярэдняй школы № 37 Магілёва І.Шчарбаковым.

Артыкул намесніка дырэктара па англійскай мове сярэдняй школы № 154 Мінска, выдатніка народнай адукацыі С.Варанцовай "Зямля Беларусі", працяг артыкула настаўніка-мастацтвазнаўца Мінскага мастацкага ліцэя Л.Турлая "Мастацтва Беларусі" і працяг артыкула старшага выкладчыка Наваполацкага дзяржаўнага універсітэта, кандыдата філалагічных навук Н.Лысовай "Што такое мастацтва кіно?" змешчаны пад рубрыкай "Тэма са школьнай праграмы".

Не толькі для педагогаў, але і для бацькоў карысным будзе артыкул загадчыка лабараторыі сямейнага выхавання Нацыянальнага інстытута адукацыі В. Чэчата "Сямейнае выхаванне: з гісторыі і сучаснасці", які надрукаваны пад рубрыкай "Навуковыя паведамленні, публікацыі".

Завяршаецца нумар артыкулам старшага выкладчыка кафедры методыкі выкладання рускай мовы і літаратуры Белдзяржуніверсітэта В. Карашкінай, прысвечаным аналізу творчасці М. Ю. Лермантава з нагоды 180-годдзя з дня нараджэння паэта.

Уладзімір ЯКУБОВІЧ.

Міжнародныя кантакты — стымул развіцця нацыянальнай адукацыйнай сістэмы

Сістэма нацыянальнай адукацыі не можа быць замкнёнай і закрытай, адмежаванай ад сусветных дасягненняў і тэндэнцый. Яна актыўна інтэгруецца ў сусветны адукацыйны працэс, акумулюе лепшыя дасягненні іншых краін. Дзеля гэтага створаны механізм пастаяннага ўзаемаўплыву і сувязі з адукацыйнымі сістэмамі перадавых краін, які абапіраецца на дыпламатычную службу, прадстаўніцтва Беларусі ў ААН, ЮНЕСКО, іншых міжнародных арганізацыях, на беларускую дыяспару.

Якія ж найбольш важныя і перспектыўныя накірункі міжнароднага супрацоўніцтва органаў адукацыі сёння? Папершае, гэта ўстанаўленне і развіццё шматбаковых сувязяў навуковых і навучальных устаноў з аналагічнымі органамі за мяжой. Такія сувязі мяркуюць пастаянны абмен навуковымі работнікамі, выкладчыкамі і настаўнікамі, студэнтамі і вучнямі, навучэнцамі, арганізацыю іх стажыровак у розных краінах, рэалізацыю сумесных навукова-даследчых і навучальных праектаў, планаў і праграм. Па-другое, гэта ўважлівае вывучэнне і выкарыстанне перадавога замежнага вопыту і вынікаў навуковых даследаванняў па перспектыўных метадыках адукацыі і выхавання, па новых адукацыйных тэхналогіях. І для нас важны такі вопыт не толькі развітых краін (ЗША, Германіі або Японіі), але і шэрагу краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы тыпу Чэхіі, Славакіі, Польшчы або Румыніі, якія прайшлі ўжо рэформы ў сферы адукацыі або знаходзяцца на апошнім этапе хваравітага рэфармавання сваіх нацыянальных адукацыйных сістэм. Па-трэцяе, гэта правядзенне мерапрыемстваў па ўзаемным прызнанні дыпломаў і ўзроўняў кваліфікацыі, навуковых ступеняў і званняў, пераліку прафесій, спецыяльнасцяў, навучальных планаў. Канчатковай мэтай такіх мерапрыемстваў павінна стаць стварэнне нацыянальнай сістэмы стандартызацыі і сертыфікацыі адукацыі. Не ведаючы сусветных дасягненняў і тэндэнцый, а таксама вопыту замежных краін у вырашэнні гэтай праблемы, складана стварыць штосьці новае, якое б адпавядала міжнародным стандартам напярэдадні новага стагоддзя. Па-чацвёртае, гэта арганізацыя падрыхтоўкі навуковых кадраў і спецыялістаў у сферы адукацыі для замежных краін у навучальных установах краіны, а для яе — за мяжой.

Гэтымі накірункамі, вядома, далёка не вычэрпваецца ўвесь спектр міжнароднага супрацоўніцтва, ён пастаянна ўзбагачаецца на новыя грані і формы. Навукова-педагагічнай грамадскасцю, органамі кіраўніцтва адукацыяй сёння пачата вывучэнне кан'юнктуры сусветнага рынку адукацыі і выхавання, праводзіцца камерцыйная прапрацоўка і рэклама за мяжой праводзімых даследаванняў, а таксама метадык і сродкаў навучання, што выкарыстоўваюцца ў Беларусі. Вельмі перспектыўным накірункам можа стаць продаж ліцэнзій і педагагічных новаўвядзенняў, які, пры правільнай яго пастаноўцы, дазволіць мадэрнізаваць навучальна-метадычную, навуковую і матэрыяльна-тэхнічную базу адукацыі і на аснове перадавога вопыту (з выкарыстаннем замежнага інтэлектуальнага патэнцыялу) дапаможа вырашыць шмат якія вузлавыя праблемы нашай нацыянальнай школы.

Пасяховая рэалізацыя праводзімых рэформаў, з'яўленне новых формаў міжнароднага супрацоўніцтва звязаны ў першую чаргу з выкананнем дзеючых і заключэннем новых міжнародных, міжурадавых і міжведамасных дагавораў і пагадненняў у адукацыйнай сферы. Паводле даных Міністэрства адукацыі, у мінулым навучальным годзе навучальныя ўстановы Рэспублікі супрацоўнічалі ў рамках 123 пагадненняў з навучальнымі ўстановамі, прадпрыемствамі і фірмамі ЗША, Вялікабрытаніі, Германіі, Італіі, Іспаніі, Швейцарыі, Аўстрыі, Японіі, Кітая, Польшчы, Румыніі, Чэхіі, Славакіі, іншых краін.

У 1992—94 гадах працягвалася работа па пагадненнях аб супрацоўніцтве паміж нашым Міністэрствам адукацыі і Міністэрствам нацыянальнай адукацыі Польшчы, Дзяржкамітэтам КНР па пытаннях адукацыі, Пекінскім упраўленнем вышэйшай адукацыі, па Пратаколу паміж урадамі Беларусі і ФРГ. У цяперашні час вывучаюцца прапановы аб падрыхтоўцы пагадненняў у сферы адукацыі з міністэрствамі адукацыі Казахстана, Таджыкістана, Балгарыі, Турцыі, Індыі, Ізраіля, Македоніі і Нідэрландаў. Падрыхтаваны праект адпаведных пагадненняў з міністэрствамі адукацыі Чэхіі, Славакіі, Літвы, Расіі, Украіны. Экспертамі абодвух бакоў падрыхтаваны для падпісання пагадненні з міністэрствамі адукацыі Польшчы і Румыніі.

Найбольш паспяхова развіваюцца двухбаковыя сувязі з Федэратыўнай Рэспублікай Германіі. З удзелам нямецкіх спецыялістаў праведзены шэраг семінараў, беларускія вучоныя накіроўваліся ў ФРГ на кароткатэрміновыя стажыроўкі і канферэнцыі. У Наваполацку прайшоў семінар для вышэйшых навучальных устаноў інжынернага профілю з удзелам 6 рэктараў нямецкіх універсітэтаў, пасля чаго адбыўся візіт у адказ дэлегацыі ВНУ Рэспублікі ў Германію. Звыш 80 маладых вучоных, студэнтаў і выкладчыкаў нямецкай мовы вышэйшых навучальных устаноў Беларусі атрымалі стыпендыі Нямецкай акадэмічнай службы абменаў і прайшлі стажыроўку ў гэтай краіне. У Беларускім дзяржаўным універсітэце працягвалася сумесная з Рурскім універсітэтам работа па тэме "Даследаванне і распрацоўка метадаў і сродкаў аналізу хуткацечных працэсаў", пры выкананні якой Рурскі універсітэт забяспечваў пастаўку камплектуючых вырабаў, неабходных для ажыццяўлення праекта МІКС-РЭГАТА па стварэнні бартавога касмічнага часапралётнага мас-спектрометра зараджаных ёнаў сонечнага ветру, а наш універсітэт стварыў усе электронныя блокі. З Бахумскім універсітэтам вядуцца кансультацыі па стварэнні ў сталіцы Рэспублікі Тэхнапарка.

У красавіку гэтага года Рэспубліку наведаў прафесар універсітэта ў Франкфурце-на-Майне, прэзідэнт Сусветнага савета таварыстваў параўнальнай адукацыі Вольфганг Мітэр, які прачытаў шэраг лекцый для вучоных-педагогаў і студэнтаў, наведаў установы адукацыі Мінска, падпісаў пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Нацыянальным інстытутам адукацыі і Нямецкім інстытутам міжнародных педагагічных даследаванняў.

Па праграме работ паміж Ізілінскім тэхнічным універсітэтам (КНР) і Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміяй праводзяцца сумесныя навуковыя даследаванні па распрацоўцы аўтаматычнай сістэмы кіравання трансмісіяй і перадачы яе па кантракту аўтазаводу ў г.Уаньчунь. Бакі пачалі сумесныя даследаванні ў галіне ліцейнай вытворчасці і ўкараненні іх вынікаў на заводах Кітая.

На міжнародным сімпозіуме па прыватным кантролі ў г.Хершы (ЗША) з боку замежных спецыялістаў была праўлена цікавасць да распрацоўкі Мінскага універсітэта радыёэлектронікі і інфарматыкі "Аптымальны і субаптымальны сінтэз фільтраў на паверхнёвых акустычных хвалях".

Такія кантакты стымулююць навуковыя даследаванні, паскараюць працэс укаранення іх вынікаў на практыцы, садзейнічаюць павышэнню іх эфектыўнасці і паляпшэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў.

Актыўна вядзецца работа па падрыхтоўцы замежных спецыялістаў у навучальных установах нашай дзяржавы, якая ажыццяўляецца па больш чым 60 спецыяльнасцях. Занятні, як правіла, праводзяцца па навучальных планах і праграмах беларускай школы, у адных навучальных групах сумесна з беларускімі студэнтамі. Для пасяховага авалодання ведамі для замежных грамадзян адкрыты спецыяльныя падрыхтоўчыя факультэты, на якіх яны вывучаюць рускую мову, іншыя дысцыпліны. Па шэрагу прафілюючых прадметаў уводзены спецкурсы, што адлюстроўваюць спецыфіку будучай прафесійнай дзейнасці замежных грамадзян пасля іх вяртання на радзіму. Выпускнікі навучальных устаноў Беларусі з ліку замежных грамадзян пасяхова працуюць у сваіх краінах, многія з іх знаходзяцца на адказных пасадах у дзяржаўных органах, ва ўстановах навукі, адукацыі, культуры, фірмах і прадпрыемствах. Установы адукацыі, якія рыхтавалі іх, падтрымліваюць сувязі са сваімі выпускнікамі, аказваюць ім неабходную кансультацыйную дапамогу па павышэнні кваліфікацыі, устанаўліваюць дзелавыя кантакты, арганізуюць семінары выпускнікоў.

У цяперашні час у навучальных установах краіны навучаюцца 2,5 тысячы замежных грамадзян з 93 дзяржаў блізкага і далёкага замежжа. Па відах фінансавання яны падраздзяляюцца на 3 групы. Найбольш значную — 1700 чалавек — складаюць студэнты, якія прыняты на вучобу ў адпаведнасці з міждзяржаўнымі пагадненнямі былога СССР. Прыкладна 1200 замежных грамадзян навучаюцца на аснове дагавораў, заключаных навучальнымі ўстановамі з юрыдычнымі арганізацыямі і фізічнымі асобамі, 168 — на аснове міждзяржаўных пагадненняў Рэспублікі Беларусь.

Прытрымліваючыся гуманістычнага курсу на пашырэнне маштабаў міжнароднага супрацоўніцтва, толькі ў 1993 годзе па розных міжнародных каналах за мяжу было камандіравана 2105 навукова-педагагічных работнікаў і 6335 студэнтаў і вучняў школ, прынята, адпаведна, 814 і 1012 чалавек. Апрача гэтага, у краіны блізкага і далёкага замежжа было накіравана больш як 23000 навучэнцаў з раёнаў, якія пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС і жывуць на забруджаных радыенуклідамі тэрыторыях. Адбыўся таксама абмен групамі навучэнцаў сярэдніх школ Беларусі і Вялікабрытаніі, Даніі, ЗША, Францыі, Аўстрыі, Галандыі. Толькі ў 1993 годзе такіх навучэнцаў было больш як 800 чалавек. 43 вучні сярэдняй школы, 4 студэнты і 5 выкладчыкаў ВНУ Рэспублікі ў жніўні 1993 года былі накіраваны на 1 год на вучобу ў школы і універсітэты ЗША па лініі Фонду Сораса. 216 выкладчыкаў і навуковых супрацоўнікаў ВНУ ў верасні—кастрычніку мінулага года прынялі ўдзел у 1 туры конкурсу Эдмунда Маскі за права атрымання стыпендый для стажыроўкі ва універсітэтах Злучаных Штатаў. 294 чалавекі з ліку вучоных-педагогаў прынялі ўдзел у міжнародных канферэнцыях, семінарах, сімпозіумах.

Пашыраюцца супрацоўніцтва і сувязі ўстаноў адукацыі краіны з Камітэтам па адукацыі і культуры Савета Еўропы, ЮНЕСКО, Міжнародным бюро асветы. 18 кастрычніка мінулага года Беларусь далучылася да Еўрапейскай культурнай канвенцыі, што дазваляе прымаць удзел у еўрапейскіх праектах па сярэдняй і вышэйшай адукацыі, акадэмічнай мабільнасці і прызнанні дыпломаў.

Значную ролю ў расшырэнні міжнароднага супрацоўніцтва, кантактаў з міжнароднымі арганізацыямі па адукацыі, навуцы і культуры адыгрывае Нацыянальны інстытут адукацыі. Ён удзельнічае ў міжнароднай сетцы ЮНЕСКО-КОРДЭ, на аснове Дагавора з ЮНЕСКО і Варшаўскім інстытутам адукацыйных даследаванняў ажыццяўляе праект па сацыяльнай рэабілітацыі ў рамках праекта "ЮНЕСКО—Чарнобыль", да якога ў студзені мінулага года далучыліся Маскоўскі інстытут адукацыйных сістэм і Навукова-даследчы інстытут педагогікі Акадэміі педагагічных навук Украіны. Інстытут працягвае супрацоўніцтва з Цэнтрам па вышэйшай адукацыі (СЕПЕС) у Бухарэсце, на стадыі практычнай рэалізацыі знаходзіцца праект "ЮНІКОМ", які дазваляе ўвайсці ў інфармацыйную сетку па вышэйшай адукацыі ў Еўропе. Інстытут таксама актыўна ўдзельнічае і ў іншых міжнародных акцыях і праектах: 2000+; XXX Міжнароднай праграме падрыхтоўкі кіраўнікоў у сферы планавання і кіравання адукацыяй; праграмах навуковых абменаў і іншых. Апошнім часам інстытут устанавіў кантакты з Еўрапейскай асацыяцыяй міжнароднай адукацыі са штаб-кватэрай у Галандыі, галандскай арганізацыяй за міжнароднае супрацоўніцтва ў галіне вышэйшай адукацыі, Інстытутам адукацыі Лонданскага універсітэта, Нацыянальным фондам даследаванняў па праблемах адукацыі Англіі і Уэльса.

У кастрычніку 1993 года дэлегацыя вучоных Нацыянальнага інстытута адукацыі наведала Злучаныя Штаты Амерыкі, у выніку чаго пасля праведзеных сустрэч, гутарак і кансультацый дасягнута дамоўленасць аб рэалізацыі 5 сумесных праграм. Гэта стварэнне з дапамогай Дзяржаўнага універсітэта г.Грын Вэлі пры Нацыянальным інстытуце адукацыі "Факультэта сацыяльных псіхолагаў і педагогаў", арганізацыя сумесна са шпіталем Пайн Рэст навукова-практычнай праграмы "Псіхалагічная дапамога дзецям у крызісных сітуацыях", праграм "Навучальна-пазнавальнай стажыроўкі амерыканскіх спецыялістаў" з Мічыганскага дзяржаўнага універсітэта ў Мінску, навукова-практычнай праграмы "Міжнародная дапамога беларускім дзецям-сіротам" сумесна з Асацыяцыяй па ўсынаўленні "Эдопшэн Асоушэйтс" і, нарэшце, з рэдакцыяй часопіса "Беларускі дайджэст" — інфармацыйнай праграмы "Растлумачэнне ў ЗША ідэй беларускага адраджэння".

Апошняя вельмі важная і знаменальная, бо знаходзіцца ў кантэксце Дзяржаўнай праграмы "Беларусы ў свеце", ухваленай Саветам Міністраў Беларусі ў маі мінулага года і накіраванай на развіццё сувязяў з беларускай дыяспарай за мяжой, у тым ліку і ў сферы адукацыі і выхавання.

Практыка міжнароднага супрацоўніцтва навуковых калаў, навучальных устаноў, органаў кіравання адукацыяй паказвае, што развіццё разнастайных міжнародных сувязяў у сферы адукацыі, іх новыя грані і формы павінны ажыццяўляцца з улікам інтарэсаў краіны ў цэлым, а ўсе іншыя знешнія (эканамічныя, гандлёвыя, навуковыя і культурныя) кантакты абавязкова ўключаць адукацыйныя аспекты. Толькі такім чынам можна пашырыць і разнастаіць новымі гранямі міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы адукацыі, зрабіць растучыя міжнародныя сувязі важным стымулам развіцця нацыянальнай адукацыйнай сістэмы.

Уладзімір СЦЯПАНАЎ,
старшы навуковы супрацоўнік
Нацыянальнага інстытута адукацыі.

СТАНОЎЧЫ ПРЫКЛАД — ПОБАЧ

ЗАРАБЛЯЮЦЬ САМІ

У жлобінскім прафтэхвучылішчы № 143 тэкстыльшчыкаў пастаянна дбаюць аб папаўненні свайго бюджэту. Для гэтай мэты тут развіваюць уласную вытворчую базу, дзе навучэнцы пад кіраўніцтвам вопытных майстроў адначасова з праходжаннем практычнага навучання прыносяць вучылішчу і значны грашовы прыбытак.

А сёлета ў вучылішчы пайшлі яшчэ далей. Тут створаны дадатковыя вытворчыя плошчы (пашывачны цэх), куды нядаўна набралі дваццаць пяць вопытных рабочых, у асноўным былых сваіх выпускнікоў. Сёння, калі мясцовае вытворча-гандлёвае аб'яднанне штучнага футра перажывае эканамічныя цяжкасці, стварэнне дадатковых рабочых месцаў у тым жа вучылішчы можна толькі вітаць.

Пакуль цэх працуе ў эксперыментальным парадку, ідзе працэс фарміравання пастаяннага рабочага калектыву. Але ў ПТВ упэўнены, што і тут справы пойдуць паспяхова.

Мікалай ШУКАНАЎ,
супрацоўнік жлобінскай райгазеты
"Новы дзень".

ТЛУМАЧЭННЕ СПЕЦЫЯЛІСТА

Экспертызу праводзіць вылічальны цэнтр

У друку на пачатку навучальнага года з'явілася вялікая колькасць рэкламных аб'яў ад розных прадпрыемстваў і арганізацый, у тым ліку і недзяржаўных, аб праграмных сродках для адукацыі, ці методыках выкладання новага курса інфарматыкі. У сувязі з гэтым Вылічальна-аналітычны цэнтр Міністэрства адукацыі, які з'яўляецца галоўнай арганізацыяй ў галіне інфарматызацыі адукацыі, звяртае ўвагу кіраўнікоў навучальных устаноў і органаў кіравання адукацыяй, што падаваемая рэкламная інфармацыя адлюстроўвае, як правіла, асабісты погляд аўтара рэкламы і не заўсёды адпавядае пазіцыі міністэрства.

Вылічальна-аналітычны цэнтр нагадвае, што выкарыстанне гэтых сродкаў або методык магчыма толькі пры наяўнасці станоўчага акта экспертызы, выдадзенага ва ўстаноўленым парадку.

Пры парушэнні апошняга патрабавання кіраўнікі навучальных устаноў і органаў кіравання адукацыяй нясуць асабістую адказнасць у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

М. ЛІСТАПАД,
дырэктар вылічальна-аналітычнага
цэнтра Міністэрства адукацыі.

НГ-ІНФАРМ

ТЭЛЕБАЧАННЕ НА ЎРОКУ

ПРЫРОДАЗНАЎСТВА
ПА СТАРОНКАХ ЧЫРВОНАЙ КНІГІ БЕЛАРУСІ

3, 4 кастрычніка 3-ці клас

У перадачы расказваецца аб тым, што прырода — вельмі складаны комплекс, у якім усе з'явы цесна звязаны паміж сабой. Зазначаецца, што ўсё менш і менш застаецца на зямлі месц, не кранутых гаспадарчай дзейнасцю чалавека, а гэта значыць, што меней становіцца раслін і жывёл, некаторыя з іх знікаюць назаўсёды. У "Чырвоную кнігу Беларусі" занесены рэдкія, у тым ліку тыя, што знаходзяцца пад пагрозай знікнення, віды жывёл і раслін.

З дапамогай кінакадраў вучні пазнаёмяцца з некаторымі прадстаўнікамі беларускай флоры, што трапілі на старонкі "Чырвонай кнігі" (сон-трава, званочак, зубніца, лунік, пярэсна, венерын чаравічак, пылкагалоўнік, валжанка, чарамша, першацвет, гарлачык белы) і фаўна (лебедзь-шыпун, чорны бусел, пугач, шэры журавель, зубр, буры мядзведзь, барсук, чорная рапуха).

На заканчэнне вучні даведаюцца пра новае выданне "Чырвонай кнігі", якое амаль утрая большае, чым першае.

Аўтар перадачы Н.КУКЕВІЧ.

ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА
ПЕЙЗАЖ У ТВОРАХ БЕЛАРУСКІХ МАСТАКОЎ

4, 5 кастрычніка 5 клас

На пачатку перадачы вядучы прапануе гледачам паразважаць — што такое "пейзаж", або па-беларуску — "краявід", нагадвае, што ў выяўленчым мастацтве існуюць розныя жанры — і сярод іх — "краявід", такі твор, які адлюстроўвае жыццё прыроды. Вядучы прапануе параўнаць жанры "краявід" і "нацюрморт", падкрэслівае, што слова "нацюрморт" з французкай мовы і азначае яно — "мёртвая натура", а на краявідзе прырода, якая жыве, жыве побач і разам з намі, а мы існуем разам з ёй...

Далей, аўтар гаворыць, што сярод беларускіх мастакоў, бадай, няма ніводнага, які ў сваёй творчасці не звяртаўся б да гэтага жанру. Але сярод іх ёсць і такія, хто працуе толькі ў жанры "краявід".

Далей вучням прапануецца разгледзець творы беларускіх мастакоў — пейзажыстаў, даецца іх характарыстыка, асаблівасць творчага почырку кожнага мастака.

На заканчэнне гаворкі вядучы паведамляе аб тым, што кожны мастак, як і кожны чалавек, бачыць прыроду па-свойму, што трэба заўсёды вучыцца не толькі бачыць наваколле, але і старацца ўглядацца ў сябе — якія пачуцці абуджае той ці іншы краявід.

Аўтар і вядучы — мастак І. СЦЕПАНЕНКА.

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА
"ДРЭМЛЕ ПАМЯТКА ДЗЁН..."
(паэма Янкі Купалы "Курган")

6, 7 кастрычніка 7-ы клас

Тэлеперадача прысвечана аднаму з самых узнёслых і рамантычных твораў Янкі Купалы — паэме "Курган". У ёй паэт выказаў справдешную мару і неадольнае імкненне не простых людзей да волі, свабоды, незалежнасці.

Сямікласнікі даведаюцца пра гісторыю стварэння паэмы, пра вялікую пашану і цікавасць паэта да вуснай народнай творчасці. Яна шмат у чым жывіла творчасць самога Янкі Купалы, давала яму тэмы, сюжэты, вобразы.

У выкананні артыстаў паэма прагучыць амаль цалкам.

Аўтар перадачы — Дж. КАЧАТКОВА.

НАПЯРЭДАДНІ

МІНСК ЧАКАЕ ЮНЫХ МІРАТВОРЦАЎ

Два гады таму ў Маскве пачала сваю міратворчую дзейнасць міжнародная асацыяцыя "Юнацтва планеты", якая аб'яднала вакол сябе вучняў школ, актывістаў клубаў інтэрнацыянальнай дружбы, педагогаў краін СНД, Чэхіі, Балгарыі, Румыніі. Аб'яднала людзей, якія паставілі перад сабою высакародную мэту — выхаванне ў дзяцей і падлеткаў пачуцця глыбокай павагі да мовы, гісторыі, культуры кожнай нацыі і народнасці краін СНД і бліжняга замежжа, умацаванне дружбы і супрацоўніцтва паміж дзецьмі і педагогамі ўсіх краін свету.

За гэтыя два гады актывісты цэнтраў дзіцяча-юнацкай дыпламатыі разам са сваімі настаўнікамі і кіраўнікамі прынялі ўдзел у чатырох міжнародных акцыях: маскоўскім фестывалі "Дружба-92", а таксама ў маскоўскай сустрэчы дзяцей пад назвай "Знаёмства з рускай гісторыяй і культурай", краснадарскім фестывалі "Дружба-93" і ў кішынёўскай сустрэчы "Знаёмства з гісторыяй і культурай Малдовы". Кожны такі фестываль і сустрэча пакінулі ў душах і сэрцах юных міратворцаў незабыўныя ўражанні ад новых знаёмстваў, ад цудоўнай творчасці спевакоў і музыкантаў, танцораў і адмысловых майстроў народнай творчасці, дапаматлі дзецям завязаць па-сапраўднаму сяброўскія ўзаемины, яшчэ глыбей пазнаць гісторыю і культуру розных народаў. І ўсё гэта адбываецца дзякуючы актыўнай рабоце міжнароднай асацыяцыі "Юнацтва планеты", якую ўзначальвае кандыдат філалагічных навук Менашыр Сімхаевіч Азізаў. Дзесяткі захопленых педагогаў пачалі актыўна арганізоўваць філіялы гэтай грамадскай арганізацыі ў краінах СНД і далёкага замежжа. А з 3 па 9 студзеня 1995 года міжнародны фестываль "Знаёмства з гісторыяй і культурай Беларусі" адбудзецца ў Мінску. Ужо створаны аргкамітэт па правядзенні фестывалю, складзена прыкладная яго праграма. Міжнародная асацыяцыя гарантуе бясплатнае харчаванне, пражыванне і культурную праграму больш як 250 удзельнікам гэтай цікавай сустрэчы. Яны прыедуць да нас з Расіі, Казахстана, Малдовы, Украіны, Прыбалтыкі, Чэхіі, Арменіі і Грузіі. Самыя лепшыя юныя музыканты, спевакі і танцоры прадэманструюць мастацтва сваіх краін і народаў.

Фестываль абяцае быць цікавым і насычаным сустрэчамі са знакамітымі людзьмі Беларусі: пісьменнікамі, артыстамі, дзеячамі мастацтва і культуры. Таму асацыяцыя "Юнацтва планеты" запрашае ў першую чаргу юных мінчан і педагогаў прыняць удзел у фестывалі. Вас чакаюць незабыўныя сустрэчы і цікавыя знаёмствы.

Ірына КУЛІКОЎСКІХ.

ДАРОСЛЫЯ ПРАБЛЕМЫ ДЗІЦЯЧАГА САДА

Пад выглядам капрамонту

Беларускае оптыка-механічнае аб'яднанне, больш вядомае ў народзе як завод Вавілава, на дадзены момант утрымлівае дзевяць дзіцячых садкоў. І ўтрымлівае не без праблемаў, пра што сведчыць прынятае кіраўніцтвам БелОМА рашэнне закрыць дзіцячы сад № 378. Закрыць пад выглядам неабходнасці правядзення капітальнага рамонту будынка. Праўда, калі 378-ы садок збіраліся аддаць пад прыватную жаночую гімназію, праблемы з рамонтам чамусьці не паўставалі.

Камісія Мінгарвыканкама прызнала неабгрунтаваным рашэнне правесці капітальны рамонт дзіцячага сада № 378 у цяперашні час. Акрамя таго выяўлены факт закрыцця дзіцячага сада № 133, які таксама знаходзіцца на ўтрыманні БелОМА. На падставе распараджэння Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па няўхільным выкананні Пастановы Вярхоўнага Савета № 1646-XII ад 26 красавіка 1992 году "Аб захаванні і развіцці сеткі дзіцячых і дашкольных устаноў" Камісія Мінгарвыканкама папярэдзіла кіраўніцтва БелОМА пра недапушчальнасць падобных фактаў.

Як бачым, на гэты раз справядлівасць атрымала перамогу. Хоць і "пераможаных" зразумець можна: у спецыфічных умовах тутэйшага рынку ім таксама трэба неяк выжываць.

Але, безумоўна, не за кошт сваіх жа нашчадкаў.

506-ы запрашае

Дзіцячым садочкам №506, які знаходзіцца ў сталічным мікрараёне Вясняўка, апякуецца ўсё тое ж БелОМА. Садочак, трэба сказаць, раскошны, разлічаны аж на трыста чалавечкаў. На жаль, на сённяшні дзень яго наведваюць прыкладна восемдзесят дзетак. Адна з галоўных прычынаў малой напаўняльнасці — малая нараджальнасць у нашай краіне.

І таму 506-ы з нецярпеннем чакае, калі ж нарэшце маладыя сем'і зробяць уваходзіны ў новыя кватэры тых дамоў, якія сёння будуюцца зусім побач з яго тэрыторыяй. Праўда, гэта толькі спадзяванні. Бо невядома яшчэ, хто атрымае кватэры: калі ўсё тыя ж "ветераны войны и труда", а дакладней, а іх унукі-праўнукі, то ад апошніх чакаць дэмаграфічнага выбуху не выпадае. Ды і не навядуць яны сваіх чадаў дзіцячы садок, хоць бы і такі раскошны, як 506-ы. Проста іх фінансы дазваляюць ім наймаць нянечак. Што ж да звычайных рабочых беларускіх сем'яў, то іх бюджэты дазваляюць хіба што ледзьве зводзіць канцы з канцамі...

Але ёсць праблема, якую цяжка вытлумачыць толькі агульнай катастрафічным збяднеццем асноўнай часткі грамадства. Я маю на ўвазе крадзёж у дзіцячых садах. У 506-м, напрыклад, у прамым сэнсе слова падрэзалі тэлефон. Прыйшлося яго работнікам пайсці на хітрасць і паставіць старэнькі чорны апарат яшчэ паваеннай пары 50-х. Яго пакуль што не чапаюць.

Габелены ў рамках, інкрустацыі саломкай, керамічныя барэльефы прыкручылі да сценаў шрубамі: цяпер каб сарваць, трэба пастарацца.

Традыцыйнымі сталі "экспрапрыяцыі" дзіцячай вопраткі з раздзявалак. Цяжка, ведаеце, прайсці міма, калі ў твайго сыночка на плечках дэрматынавая куртачка, а ў ейнай дачушкі — цыгейкавая футрачка.

Калі і памятае наш абывацель нешта з беларускай літаратуры, дык хіба гэта: "... вдзін ходзіць у саеце

АД РЭДАКЦЫІ

Мы падтрымліваем прапанову, якую выказвае ў сваім лісце наш сталы аўтар Іван Сяргеевіч Храпавіцкі. Спадзяёмся, што запачаткаваную ім справу актыўна падтрымаюць сваімі допісамі яго калегі, і на старонках "НГ" з'явіцца Клуб матэматыкаў.

У БЯЗВАЖКІМ СТАНЕ

знаходзяцца матэматыкі, бо не маюць амаль ніякай інфармацыі аб матэматычным жыцці ў краіне

У прыкрае становішча трапілі настаўнікі матэматыкі нашай краіны. Мы да сённяшняга дня не маем свайго прадметнага часопіса. Гэта нягледзячы на тое, што матэматычная адукацыя і яе здабыткі заўсёды займалі трывалыя пазіцыі на Беларусі. У час пабудовы незалежнай дзяржавы трэба рупліва даглядаць і развіваць моцны інтэлектуальны патэнцыял. Няма неабходнасці даказваць значнасць у гэтай справе адмысловага часопіса для настаўніка. Цяпер мы знаходзімся ў бязважкім стане, бо не маем ніякай інфармацыі аб матэматычным жыцці ў краіне, пазбаўлены магчымасці кантактаваць з калегамі на дастатковым узроўні. Семінары ды курсы перападрыхтоўкі? Яны вельмі рэдкія ды абмежаваныя па форме і зместу. Не могуць нас задаволіць і тыя публікацыі, што часамі здараюцца ў "Народнай асвеце".

Вядома ж, напэўна ёсць у Міністэрстве адукацыі ды і ў іншых установах людзі, якія задумваліся над гэтай праблемай, выдатна разумеюць ейную пільнасць. Відаць, пакуль няма сродкаў, альбо проста не даходзяць рукі...

У мяне прапанова. Пакуль няма ў нас свайго часопіса, хай "Настаўніцкая газета" аказвае настаўнікам матэматыкі старонку хаця б раз на месяц.

Каб запачаткаваць справу, прапаную свой сцціплы ўнёсак у яе.

Неяк патрапіў я, гартаючы "Зборнік экзаменацыйных матэрыялаў па матэматыцы за курс сярэдняй школы", на задачу: Вышыні трохвугольніка роўныя 12, 15 і 20 см. Дакажыце, што трохвугольнік прамавугольны.

Рашэнне відавочнае. Няхай a, в, c — старана трохвугольніка, S — яго плошча. Тады, a= 2S/20, b= 2S/15, c= 2S/12. Заўважаем, што a+в=c, таму паводле тэарэмы, адваротнай тэарэме Піфагора, дадзены трохвугольнік — прамавугольны.

Каб гэтая задача была вычарпана да канца, варта паспрабаваць адшукаць яшчэ (пажадана ўсе) трохвугольнікі з цэлалікавымі вышынямі і якія з'яўляюцца прамавугольнымі.

Калі пазначыць вышыні трохвугольніка x, y, z, то дадзеная задача спараджае наступную, ужо чыста алгебраічную, дыяфантаву праблему:

Рашыць раўнанне
у цэлых ліках x, y, z.

Згараючы ад нецярплівасці, я пераклаў праблему на мову маёй "супер" -ЭВМ. "Электроніка БК-0010Ш". Тая праз хвілін 15 "прагледзела" усе x, y, z з прамежку ад 1 да 50 і выдала апроч ужо вядомай тройкі яшчэ адну 24, 30, 40. Дык гэта ж я ведаў і без камп'ютэра, бо знойдзеныя лікі прапарцыйныя лікам 12, 15, 20. Падобных "троек", рашэнняў раўнання (*), вядома, безліч. Але ці ёсць гэта ўсе рашэнні?

Прыгледзімся ўважліва да лікаў 12, 15, 20. Чым яны адметныя?.. 12=3x4, 15 = 3x5, 20 = 4x5. 3, 4, 5 — піфагорава "тройка"! А што калі паспрабаваць шукаць новыя рашэнні наступным чынам.

Няхай m, n, k — адвольная піфагорава "тройка", г.зн. m + n = k. Возьмем x = mn, y = mk, z = nk. Лёгка праверыць, што раўнанне (*) спраўджваецца пры гэтых x, y, z! Прыкладам, узяўшы піфагораву "тройку" 5, 12, 13, атрымліваем x = 60, y = 65, z = 156 — новае рашэнне раўнання (*). Але ці спараджаюць такім чынам утвораныя "тройкі" ўсе рашэнні? Пытанне па-ранейшым застаецца адкрытым. Мая старэча-ЭВМ не здатная знайсці нейкую новую, таямнічую "тройку".

Вядомы польскі матэматык В.Сярпінскі згадвае пра аналагічнае раўнанне ў сваёй кніжцы "250 задач з элементарнай тэорыі лікаў", але адказу на маё пытанне там няма.

Буду вельмі ўдзячны таму матэматыку, каму ўдасца знайсці рашэнне, якое не падпадае пад формулы x = mn, y = mk, z = nk. Асабіста ў мяне ёсць прадчуванне, што новага рашэння "тройкі" няма.

Іван ХРАПАВІЦКІ,
настаўнік матэматыкі школы №3 Глыбокага.

КАЛІ ВЫ ПРАЦУЕЦЕ Ў КЛАСЕ З ПАГЛЫБЛЕНЫМ ВЫВУЧЭННЕМ ДАКЛАДНЫХ НАВУК, ЛІЦЭІ, КАЛЕДЖЫ, НОВЫ НАВУКОВА-ПАПУЛЯРНЫ ЧАСОПІС

"ФОКУС" — ВАША ВЫДАННЕ!

Вы пазнаёміцеся з умовамі ўдзелу ў фізіка-матэматычных конкурсах і алімпіядах, з нестандартнымі задачамі і прыкладамі, спосабамі іх рашэння, цікавымі звесткамі з гісторыі беларускай і сусветнай навукі. Яны дапамогуць вам зрабіць урокі больш цікавымі і змястоўнымі, заахвоцяць вучняў да вывучэння свайго прадмета.

Матэрыялы "Фокуса" будуць карысныя і для тых настаўнікаў, якія працуюць у звычайных школах, але іх не задавальняюць існуючыя падручнікі, і для тых, хто не ведае, чым зацікавіць сваіх найбольш здольных і наўрымслівых вучняў.

"Фокус" будзе добрым памочнікам настаўнікам, якія пераходзяць на выкладанне на беларускай мове. У планах часопіса — друкаваць беларускія тэрміналагічныя слоўнікі па асобных раздзелах фізікі і матэматыкі.

Заснавальнікі часопіса — Міністэрства адукацыі Белдзяржуніверсітэт, БелНДІ адукацыі, Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі.

Галоўны рэдактар часопіса — доктар фізіка-матэматычных навук В. А. Гайсёнак.

Выдаецца штоквартальна.

Падпіска на часопіс праводзіцца па месцы жыхарства ў мясцовым аддзяленні сувязі. Індэкс выдання № 75017. Адрас рэдакцыі: 220600, г. Мінск, вул. Ульянаўская, 8.

СЛЕД У НАВУЦЫ

НА КАРЫСЦЬ БЕЛАРУСІ

Споўнілася 75 гадоў выдатнаму вучонаму, педагогу, заслужанаму дзеячу навукі Беларусі, доктару філалагічных навук, прафесару Міхаілу Гапеевічу Булахаву. Налёгкі, але слаўны жыццёвы і творчы шлях прайшоў вучоны. Ён нарадзіўся ў вёсцы Маслакі Горацкага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і. З 1928 года па 1935-ты вучыўся ў Маслакоўскай сямігадовай школе, а па заканчэнні яе — на шасцімесячных падрыхтоўчых курсах пры Магілёўскім педагагічным інстытуце. З 1936 года — студэнт факультэта мовы і літаратуры гэтага ж інстытута. Аднак у сувязі з нястачай настаўнікаў у школах рэспублікі пасля трох гадоў навучання накіроўваецца на педагагічную працу ў якасці выкладчыка беларускай і рускай мовы і літаратуры Дулебненскай сярэдняй школы Клічаўскага раёна Магілёўскай вобласці.

Летам 1940 года экстэрнам здаў дзяржаўны экзамен па праграме інстытута, а восенню гэтага ж года прызываецца на абавязковую воінскую службу ў рады Савецкай Арміі. Да пачатку Айчыннай вайны служыў у Прыбалтыйскай ваеннай акрузе, у ваенныя гады — у дзеючай арміі на розных франтах — Заходнім, Калінінскім, Бранскім, 1-м Украінскім. Удзельнічаў у абарончых баях на тэрыторыі Літвы, Беларусі, Вялікалукскай, Смаленскай і Маскоўскай абласцей. Абараняў подступы да сталіцы нашай Радзімы — Масквы, а са снежня 1941 па люты 1942 г. удзельнічаў у гістарычным контрнаступленні савецкіх войск пад Масквой, у выніку якога гітлераўскія полчышчы былі адкінуты ад Масквы на 200—300 кіламетраў на захад. Ваяваў на Цэнтральным напрамку Заходняга фронту, змагаўся за вызваленне Правабярэжнай Украіны, прымаў удзел у фарсіраванні рэк Заходні Буг, Вісла, Одэр, Нейсе і ў завяршальных баях за Берлін і Прагу. Быў двойчы паранены і кантужаны. За баявыя заслугі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны ўзнагароджаны ордэнамі Чырвонай зоркі, Айчыннай вайны II ступені і медалямі. Пасля заканчэння вайны з мая 1945 года працягваў службу ў Цэнтральнай групе савецкіх войск, падраздзяленнях, якія дыслацыраваліся на тэрыторыях Чэхаславакіі і Венгрыі. Звольнены з радоў Савецкай Арміі ў запас у снежні 1945 года.

Закончылася ваеннае ліхалецце, наступілі мірныя ставаральныя дні. Новыя задачы паўсталі перад былым франтавіком. Надышоў час здзяйснення даўніх задум і мараў, запаветных памкненняў і планаў.

І вось на пачатку новага 1946 года М.Г.Булахаў паступае ў аспірантуру пры Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце, якую закончыў у 1949 годзе. Вучобу ў аспірантуры на апошнім годзе яе праходжання сумяшчаў з педагагічнай работай. Са жніўня 1949 года Міхаіл Гапеевіч — загадчык кафедры рускай мовы, чытае курсы гісторыі рускай літаратурнай мовы, гістарычнай граматыкі, дыялекталогіі, сучаснай рускай мовы, вядзе спецкурсы па актуальных пытаннях мовазнаўства. Мне як былому студэнту інстытута і сёння дужа памятныя змястоўныя, насычаныя багатым фактычным матэрыялам лекцыі М.Г.Булахава; яго эрудыцыя, глыбокая аргументаванасць у выкладзе важных тэарэтычных палажэнняў лінгвістыкі. У 1950 годзе ён паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю ў Інстытуце мовы, літаратуры і мастацтва АН БССР, а праз некаторы час — у снежні 1951 года — пераходзіць на сталую даследчую работу ў гэту навуковую ўстанову, дзе спачатку працаваў на пасадзе старшага навуковага супрацоўніка інстытута, а з 1952 года — загадчыка сектара сучаснай беларускай мовы.

На гэтай пасадзе ён прапрацаваў у інстытуце чатырнаццаць гадоў. У 1965 годзе па конкурсу быў абраны загадчыкам кафедры рускай мовы Белдзяржуніверсітэта, дзе абараніў і доктарскую дысертацыю. У 1966 годзе рашэннем ВАК яму была прысуджана вучоная ступень доктара філалагічных навук, а ў 1967 годзе — вучонае званне прафесара. З красавіка 1975 года па чэрвень 1990-га загадваў кафедрай агульнага і рускага мовазнаўства Мінскага педагагічнага інстытута (з 8 верасня 1993 года — Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта), дзе працуе і сёння на пасадзе прафесара кафедры тэорыі і гісторыі мовы. Такія ў агульных рысах штрыхі з біяграфіі юбіляра, яго жыццёвага і творчага шляху.

Як вучоны, даследчык, педагог М.Г.Булахаў пастаянна і нязменна, незалежна ад месца працы і вучобы ўдзяляў і ўдзяляе неаслабную ўвагу творчай, навукова-даследчай рабоце. Шырокая і разнастайная тэматыка яго навуковых інтарэсаў, пошукаў, незвычайна багатыя і плённыя творчыя набыткі даследчыка. Гэта — і шматлікія навучальныя дапаможнікі, падручнікі, зборнікі прац, заданняў, метадычныя распрацоўкі і практыкумы для вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, педвучылішчаў, гэта — і фундаментальныя навуковыя даследаванні складаных тэарэтычных праблем лінгвістыкі, пісьмовых помнікаў, твораў мастацтва, старажытнай пісьменнасці, творчай спадчыны выдатных айчынных і сучасных мовазнаўцаў. За перыяд работы ў вышэйшых навучальных установах, Інстытуце мовазнаўства Акадэміі навук Рэспублікі ім апублікавана каля 250 навуковых прац па беларускім, рускім і славянскім мовазнаўстве, у іх ліку 12 кніг і яшчэ 15 кніг у саўтарстве.

Ён узначаліў аўтарскія калектывы для напісання такіх каштоўных і так неабходных падручнікаў і навучальных дапаможнікаў для студэнтаў філалагічных факультэтаў вышэйшых навучальных устаноў, як "Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы" ў трох кнігах (1957—1961 гг.), "Нарысы па гісторыі беларускай мовы" (1957), з'яўляецца саўтарам калектыўных прац "Правілы беларускага правапісу і пунктуацыі" (1957), "Беларуская мова" ў 2-х частках для педвучылішчаў (1955—1958, 1968 гг.), адным з рэдактараў і саўтараў першай у беларускім мовазнаўстве акадэмічнай нарматыўна-апісальнай "Граматыкі беларускай мовы" ў двух тамах (1962—1966 гг.) агульным аб'ёмам у 117 друк.арк. Ім асабіста падрыхтаваны зборнікі прац "Практыкаванні і матэрыялы па гісторыі беларускай мовы" (1956), "Практыкаванні і матэрыялы па курсу гісторыі беларускай мовы" (1969) і іншыя.

Шмат увагі ўдзяляў вучоны і рускай мове. Ён аўтар практыкума "Сборник задач и упражнений по синтаксису древнерусского языка" (1953), "Основные вопросы сопоставительной стилистики русского и белорусского языков" (1979), "Функционирование русского языка в близкородственном языковом окружении" (1981). Пад яго рэдакцыяй выйшаў у свет навучальны дапаможнік для аддзяленняў беларускай мовы і літаратуры педагагічных навучальных устаноў "Русский язык" (1979) аб'ёмам у 35 арк., пазней перапрацаваны і перавыдадзены ў 1993 годзе ў 2-х частках.



Новым словам у лінгвістыцы з'явіліся манаграфічныя выданні вучонага, як "Развіццё беларускай літаратурнай мовы ў XIX—XX стст. ва ўзаемадносінах з іншымі славянскімі мовамі" (1958), трохтомнае даследаванне аб беларускім прыметніку, у ліку якіх "Прыметнік у беларускай мове" (1964), "Гісторыя прыметнікаў беларускай мовы XIV—XVIII стагоддзяў. Сінтаксічны нарыс" (1971), "Гісторыя прыметнікаў беларускай мовы. Лексікалагічны нарыс" (1973), бібліяграфічны слоўнік "Восточнославянские языковеды" ў трох тамах (1976—1978 гг.), у якім змешчаны нарысы пра жыццё і навуковую дзейнасць 352-х усходнеславянскіх мовазнаўцаў ад XVI да 70-х гадоў XX ст. і па які ў выніку выключнай значнасці і важнасці даследавання паступіла і апублікавана звыш 40 станоўчых водгукаў і рэцэнзій у розных айчынных і зарубежных выданнях, у тым ліку ў Германіі, Чэхаславакіі, Югаславіі, Балгарыі.

Асобнае месца ў серыі бібліяграфічных прац вучонага займае манаграфічнае даследаванне "Евфимий Федорович Карский: Жизнь, научная и общественная деятельность" (1981), у якім упершыню так шырока разгледжаны жыццёвы і творчы шлях заснавальніка беларускай лінгвістычнай навукі, аўтара шматлікіх навуковых прац па беларускай, рускай, украінскай і іншых славянскіх мовах.

Вялікую навуковую каштоўнасць мае і наступная навуковая праца вучонага — энцыклапедычны слоўнік "Слово о полку Игореве" в литературе, искусстве, науке" (1989), у якім старанна сабраны і сістэматызаваны ў больш чым чатырохстах артыкулах асноўныя звесткі па гісторыі помніка, яго адкрывальніка, першых і наступных даследчыкаў, перакладчыкаў, ілюстратараў і выдаўцоў, разгледжаны мастацкія, жанравыя, моўна-стылістычныя адметнасці твора, яго структурныя, кампазіцыйныя своеасаблівасці, рытміка, рыфмоўка, склад, будова.

Шмат публікацый юбіляра, прысвечаных граматычнай структуры, лексічнаму складу беларускай мовы, праблемам яе ўпарадкавання, нармалізацыі, вывучэнню гістарычных сувязей з рускай, украінскай і іншымі славянскімі мовамі, пытанням слова- і формаўжывання, словаўтварэння пэўных граматычных і лексіка-семантычных разрадаў і катэгорый слоў, змешчана ў шматлікіх перыядычных выданнях, зборніках навуковых прац, часопісах, газетных матэрыялах, што выдаваліся ці выдаюцца ў нашай краіне і за яе межамі.

Разнастайнай і багатай з'яўляецца грамадская дзейнасць вучонага. Ён быў адным з рэдактараў усіх васьмі выпускаў зборнікаў "Працы Інстытута мовазнаўства АН БССР", які пачаў выдавацца з 1954 года. На працягу многіх гадоў (з 1969 па 1975 г.) з'яўляўся галоўным рэдактарам часопіса "Веснік Белдзяржуніверсітэта. Серыя 4. Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. Псіхалогія". Старшынёй спецыялізаванага Савета па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый пры філалагічным факультэце БДУ, намеснікам старшыні спецыялізаванага Савета пры Мінскім педагагічным інстытуце, членам філалагічнай секцыі Камітэта па Ленінскіх і Дзяржаўных прэміях пры Савеце Міністраў СССР.

Міхаіл Гапеевіч Булахаў — удзельнік шматлікіх рэспубліканскіх і міжнародных лінгвістычных з'ездаў, сімпозіумаў і канферэнцый па розных праблемах мовазнаўства. У верасні 1958 года ён удзельнічаў у IV Міжнародным з'ездзе славістаў, у кастрычніку 1970 года — выступаў з дакладам на міжнародай канферэнцыі ў Любляне (Югаславія), у красавіку 1972 года — у горадзе Вяліка-Тырнава (Балгарыя), у чэрвені гэтага ж года — на міжнародным сімпозіуме ў Мінску, на якім зрабіў даклад аб адзінстве лінгвістычнага і літаратуразнаўчага аналізу мастацкіх твораў.

Вялікую ўвагу ўдзяляе Міхаіл Гапеевіч падрыхтоўцы навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі. Пад яго кіраўніцтвам напісана і паспяхова абаронена 27 кандыдацкіх дысертацый. Чатыры былыя яго вучні ўжо сталі дактарамі навук.

За вялікія заслугі ў навуковай, педагагічнай і грамадскай дзейнасці Міхаіл Гапеевіч Булахаў у 1970 годзе ўзнагароджаны медалём "За доблестный труд", а ў кастрычніку 1971 года Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР прысвоіў Міхаілу Гапеевічу ганаровае званне заслужанага дзеяча навукі Беларусі. Ён узнагароджаны дзвюма Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета Беларусі.

Сёння на календары ў нас значыцца ўжо 1994 год. Толькі за гэты прамежак часу аддаленасцю амаль у чвэрць стагоддзя наш знакаміты юбіляр Міхаіл Гапеевіч Булахаў па велічы здзейсненага ў навуцы, грамадскай і культурнай сферах заслугоўвае самых высокіх урадавых узнагарод і акадэмічных званняў.

Шчыра жадаем Вам, паважаны Міхаіл Гапеевіч, моцнага здароўя і плённу працы, здзяйснення ўсіх творчых задум і планаў на карысць беларускай навукі і культуры.

Аркадзь НАРКЕВІЧ,
прафесар Белдзяржуніверсітэта,
доктар філалагічных навук.

СТАРОНКІ НОВЫХ ПАДРУЧНІКАЎ

ІНФАРМАТЫКА, 8 КЛАС

§4. СТВАРЭННЕ І РЭДАГАВАННЕ БАЗЫ ДАНЫХ

4.1. Этапы стварэння базы даных

Стварэнне базы даных з'яўляецца складаным працэсам, які мае тры асноўныя этапы:

стварэнне структуры базы даных; увод структуры базы даных з дапамогай клавіятуры; напаўненне базы даных інфармацыяй.

Першы этап выконваецца без камп'ютэра на аснове аналізу звестак будучай базы даных. Астатнія этапы выкарыстоўваюць магчымасці СКБД, якая выбраная для стварэння базы.

Напаўненне базы даных можа займаць доўгі час і яго можна прыпыняць. У такім выпадку разглядаюць яшчэ адзін этап стварэння базы даных: дапаўненне базы даных інфармацыяй.

4.2. Стварэнне структуры базы даных

Стварыць структуру базы даных — гэта значыць вызначыць колькасць палёў запісу, іх паслядоўнасць, даць імя кожнаму полю і задаць тып і даўжыню для кожнага поля.

Тып поля звязаны з асаблівасцямі захоўвання розных відаў інфармацыі ў памяці камп'ютэра. Прывядзём асноўныя тыпы палёў: сімвальны тып, абазначэнне C (character); лікавы тып, абазначэнне N (numeric). Пры стварэнні структуры базы неабходна памятаць, што нягледзячы на вялікія магчымасці камп'ютэра ўсё ж існуюць абмежаванні на колькасць палёў. Гэтыя абмежаванні залежаць ад магчымасцей СКБД.

Разгледзім працэс стварэння базы даных "Падпіска", куды ўвойдуць звесткі з даставачных картак. Растлумачым, якія звесткі будуць знаходзіцца ў кожным полі і нададзім імя кожнаму полю. У большасці СКБД для запісу імя поля можна выкарыстоўваць толькі лацінскія літары і лічбы. Адначасова вызначым тып поля і яго даўжыню.

Поле N1: Прозвішча і ініцыялы падпісчыка. Імя поля — FAM, тып — C, даўжыня — 15 (мяркуем, што 15 сімвалаў дастаткова для запісу самага доўгага прозвішча з ініцыялямі)

Поле N2: Назва выпісанай газеты або часопіса. Імя поля — NAZ, тып — C, даўжыня — 20.

Поле N3: нумар месяца, з якога пачынаецца дастаўка (напрыклад, сакавіку адпавядае лік 3, а снежню — 12). Імя поля — TN, тып — N, даўжыня — 2.

Поле N4: нумар месяца, у якім заканчваецца дастаўка. Імя поля TK, тып — N, даўжыня — 2.

Поле N5: адрас падпісчыка. Імя поля — ADR, тып — C, даўжыня — 20. Запішам для прыкладу інфармацыю з даставачных картак у выглядзе табліцы, якая мае пяць калонак (палёў будучай базы даных), а кожны радок будзе з'яўляцца запісам будучай базы даных (табл. 1).

Дадзім файлу базы даных "Падпіска" імя PODP і ўвядзём гэта імя з клавіятуры.

Імя файла даных можна задаць непасрэдна пры ўваходзе ў рэжым стварэння структуры. Тады каманда ўваходу ў рэжым стварэння структуры мае выгляд:

CREATE PODP

Абазначае: стварыць PODP

СКБД пры запісу файла на дыск аўтаматычна дабавіць да імя файла пашырэнне. Напрыклад, СУБД dDASE дабаўляе пашырэнне .DBF і на дыску файл даных будзе мець імя PODP.DBF.

Пасля ўводу імя файла базы даных на экране паявіцца новае паведамленне, сэнс якога:

УВЯДЗІЦЕ СТРУКТУРУ ЗАПІСУ
ІМЯ ПОЛЯ, ТЫП, ДАЎЖЫНЯ

Табліца 1

FAM	NAZ	TN	TK	ADR
Дзяркун С.С.	Знамя юности	1	12	Славінскага, 15-34
Пермяк М.В.	Настаўніцкая газета	1	6	Славінскага, 21-19
Шлыкаў А.К.	Народная газета	1	3	Сядых, 31-12
Шлыкаў А.К.	Настаўніцкая газета	4	12	Сядых, 31-12
Пятроў І.П.	Настаўніцкая газета	1	9	Калінoўскага, 53-78
Пянкрат В.В.	Знамя юности	7	9	Сядых, 37-42
Пянкрат В.В.	Народная газета	1	12	Сядых, 37-42

Табліца змяшчае сем запісаў. Безумоўна, для апрацоўкі самі даставачных картак камп'ютэр не патрэбен. Але на гэтым вучэбным прыкладзе можна паказаць усе магчымасці сучасных базаў даных.

4.3. Увод структуры базы даных

Для ўвода структуры базы даных СКБД павінна быць загружанай у памяць камп'ютэра. Да рэжыму стварэння структуры пераходзяць пры дапамозе меню або камандай:

CREATE
Чытаецца: [крыэйт]
Абазначае: стварыць

У адказ на гэту каманду СКБД вывядзе на экран запыт, сэнс якога "УВЯДЗІЦЕ ІМЯ ФАЙЛА".

Затым неабходна паслядоўна ўводзіць з клавіятуры апісанне першага поля: імя, тып, даўжыню. Пасля гэтага пераходзяць да апісання другога поля і г.д. Пры ўводзе апісання лікавага поля пазначаюць колькасць дзесятковых знакаў пасля коскі.

Пасля апісання ўсіх палёў СКБД выдасць запыт, сэнс якога "УВОДЗІЦЬ ДАНЫЯ?"

Пры адказе Y (YES,ТАК) СКБД пераходзіць да рэжыму запаўнення базы даных. Пры адказе N (NO, НЕ) СКБД запісвае на магнітны дыск базу даных, у якой пакуль што няма інфармацыі, а затым СКБД вяртаецца да рэжыму кіравання.

4.4. Напаўненне базы даных

У рэжым напаўнення інфармацыяй базы даных СКБД можа перайсці пасля заканчэння ўводу структуры базы даных (п.4.3).

У рэжыме напаўнення на экране дысплея адлюстроўваецца шаблон уводу з паказам імён палёў і месцам для ўводу інфармацыі. Напрыклад:

FAM: :
NAZ: :
TN : :
TK : :
ADR: :

Па правы бок ад імя поля ў шаблоне ўводу пазначана месца для інфармацыі. Гэта месца абмежавана даўжынёй поля. Напрыклад, для трэцяга поля TN зададзена даўжыня 2, а ў радку паміж межамі можна размясціць не больш за два сімвалы.

На экране адлюстроўваецца таксама паказальнік нумара актыўнага запісу. Запіс называецца актыўным, калі СКБД працуе з гэтым запісам у дадзены момант. У пачатку напаўнення базы паказальнік будзе роўны 1 (г.зн. актыўным з'яўляецца запіс нумар 1).

Возьмем першы радок табліцы 1 і, карыстаючыся клавіятурай, увядзём інфармацыю з гэтага радка. Пасля ўводу ўсіх даных першага радка (гл. табліцу 1) на экране будзе адлюстраваны запіс:

FAM: Дзяркун С.С. : :
NAZ: Знамя юности :
TN : 1 :
TK : 12 :
ADR: Славінскага, 15-34:

Гэтаму запісу будзе прысвоены нумар 1, паказальнік нумара актыўнага запісу змяняецца з 1 на 2 і на экране аўтаматычна адлюстроўваецца пусты шаблон для ўводу другога запісу.

Такім чынам, запісы па чарзе ўводзяцца ў базу даных і атрымліваюць кожны свой нумар. Калі ўзнікае неабходнасць звярнуцца да папярэдняга запісу, то гэта робяць з дапамогай клавіятуры.

Пасля ўводу апошняга сёмага запісу на экране адлюстроўваецца пусты шаблон для восьмага запісу. Увод інфармацыі заканчваюць і СКБД вяртаецца ў рэжым кіравання. У выніку ўводу база даных "ПАДПІСКА" сфарміравана і будзе захоўвацца на магнітным дыску як файл з імем PODP (пашырэнне імя дабавіць сама СКБД).

4.5. Папаўненне базы даных

Напаўненне базы даных можна перарваць на любым этапе. Незавершаная база даных будзе захоўвацца на дыску ў файле пад імем PODP.

Пры новым сеансе работы базу даных загружаюць у памяць камп'ютэра (п.3.4) і потым пераходзяць да рэжыму напаўнення (папаўнення) базы. З гэтай мэтай у камандным рэжыме кіравання набіраюць каманду:

APPEND
Чытаецца: [апэнд]
Абазначае: папоўніць

На экране адлюстроўваецца пусты шаблон уводу для запісу з нумарам на адзінку большым, чым апошні ўведзены запіс. Інфармацыю ў базу даных уводзяць таксама, як і ў папярэднім пункце.

4.6. Рэдагаванне асобных запісаў

Калі пры рабоце з базай даных знойдзены памылкі або недакладнасці ў інфармацыі, то змест запісаў базы даных можна адрэдагаваць з дапамогай СКБД, выкарыстаўшы рэжым рэдагавання.

Пры загружанай базе даных (п.3.4) пераход да рэжыму рэдагавання можна ажыццявіць з дапамогай меню або выкарыстаць у камандным рэжыме кіравання каманду:

EDIT
Чытаецца: [эдыт]
Абазначае : рэдагаваць

На экране адлюстроўваецца шаблон уводу з інфармацыяй. Ад актыўнага запісу да "суседніх" запісаў можна пераходзіць з дапамогай спецыяльных клавіш клавіятуры.

Інфармацыю запісу базы даных змяняюць прыёмамі карэкціроўкі тэкставай інфармацыі (як у тэкставым рэдактары). Цяжкасці з пошукам патрэбнага запісу могуць узнікнуць, калі база даных уключае вялікую колькасць запісаў. Дапусцім, што неабходна адрэдагаваць запіс нумар 37. У гэтым выпадку неабходна ўвайсці ў рэжым рэдагавання з дапамогай каманды:

EDIT RECORD 37
Чытаецца: [эдыт рэкод] 37
Абазначае: рэдагаваць запіс 37

Пасля ўводу каманды шаблон на экране будзе ўтрымліваць інфармацыю запісу нумар 37, аб чым сведчыць паказальнік актыўнага запісу. У рэжыме кіравання з дапамогай меню спачатку "падводзяць" паказальнік да неабходнага запісу, г.з. робяць актыўным патрэбны запіс, а потым пераводзяць СКБД у рэжым рэдагавання.

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Пералічыце асноўныя этапы стварэння базы даных.
2. Растлумачце, што абазначае стварыць структуру базы даных.
3. Пералічыце асноўныя тыпы палёў і іх абазначэнні.
4. Ёсць файл даных, які змяшчае запісы з такімі палямі: а) марка аўтамабіля; б) год выпуску; в) краіна; г) дзяржнумар; д) прозвішча ўладальніка. Дайце імёны файлу даных і палям. Абазначце тыпы палёў.
5. Які запіс базы даных называюць актыўным?

5. ПОШУК ІНФАРМАЦЫІ У БАЗЕ ДАНЫХ

5.1. Прагляд базы даных

СКБД дазваляе праглядаць на экране дысплея змесціва базы даных, якое загружана з файла на дыску. У камандным рэжыме кіравання СКБД выконвае аперацыі прагляду па камандзе:

LIST
Чытаецца: [ліст]
Абазначае : перагартаць

На экране паяўляецца інфармацыя базы даных цалкам з першага запісу да апошняга. Кожны запіс паказаны як адзін радок, у якім за інфармацыяй першага поля (дзе прабел і потым інфармацыя другога поля і г.д. Калі радок запісу не памяшчаецца на экране, то ён пераносіцца на наступны радок экрана. Кожны запіс базы даных выводзіцца на экран з новага радка.

Калі ўвесь экран запоўніцца, а запісы базы яшчэ засталіся, то новыя запісы дапісваюцца знізу і "выціскаюць" папярэдніх уверх па экрану. Пры гэтым радкі з інфармацыяй у верхняй частцы экрана знікаюць.

На экране можна прагледзець асобныя палі базы даных згодна з выбарам. Напрыклад, каб прагледзець палі FAM і ADR, у камандным рэжыме кіравання неабходна ўвесці каманду:

LIST FAM, ADR
Абазначае: перагартаць FAM, ADR

На экране будуць выведзены радкі запісаў складзеныя толькі з інфармацыі палёў FAM і ADR. Напрыклад, такі выгляд будуць мець на экране першыя чатыры запісы:

ЗапісN FAM ADR
1 ДзяркунС.С. Славінскага, 15-34
2 Пермяк М.В. Славінскага, 21-19
3 Шлыкаў А.К. Сядых, 31-12
4 Шлыкаў А.К. Сядых, 31-12

Палі для прагляду можна задаваць і ў адвольным парадку.

5.2. Пошук інфармацыі па запыту. Простыя ўмовы

Пры рабоце з базай даных карыстальніка цікавіць, як правіла, не ўся база даных, а толькі асобныя яе запісы.

Для выведу на экран неабходнай інфармацыі карыстальнік павінен даць СКБД канкрэтныя загады, што патрэбна шукаць, г.зн. сфармуляваць умовы, якім павінны задавальняць запісы, што нас цікавяць.

Для фарміравання запытаў да базы даных выкарыстоўваецца каманда LIST, у якой змешчаны ўмовы пошуку. Умовы могуць быць простыя і састаўныя.

Прывядзем прыклады простых умоў для базы даных "ПАДПІСКА":

а) FAM = 'Шлыкаў А.К.'
б) FAM = 'П'
в) TN = 7
г) TK < 9
д) TN > = 3

Згодна з умовамі а) і б) СКБД будзе шукаць запісы, у якіх інфармацыя ў полі FAM пачынаецца з названых сімвалаў. У выпадку в) гэта будуць запісы 3 і 4 (гл. табл.1), а ў выпадку б) — запісы 2, 5, 6, 7.

Згодна з умовай г) СКБД шукае запісы, якія ў полі TN маюць лік 7 (запіс 6). Умова г) пакажа на запісы 2 і 3, умова д) — на запісы 4 і 6.

Каманда LIST з умовай в) будзе мець выгляд:

LIST FOR FAM = 'Шлыкаў А.К.'
Чытаецца: [ліст фо] FAM = Шлыкаў А.К.
Абазначае: перагартаць для FAM = 'Шлыкаў А.К.'

Тут FOR службовае слова. На экран будуць выдадзены два радкі з запісам 3 і 4. Каманда LIST з выкарыстаннем умовы д) будзе мець выгляд:

. LIST FOR TN > = 3
Чытаецца: [ліст фо] TN [больш-роўна] 3
Абазначае: перагартаць для TN > = 3

СКБД дазваляе выводзіць на экран па запыту не ўвесь запіс цалкам, а асобныя палі запісаў. Няхай, напрыклад, неабходна даведацца адрас падпісчыка Пятроўа І.П. Умова пошуку будзе мець выгляд

FAM = 'Пятроў І.П.'

Выводзіць звесткі з астатніх палёў запісу не мае сэнсу, таму выведзем на экран толькі інфармацыю палёў FAM і ADR. Каманда пошуку (запыт) будзе мець выгляд:

LIST FAM, ADR FOR FAM = 'Пятроў І.П.'

Абазначае: перагартаць FAM, ADR для FAM = 'Пятроў І.П.'

На экране паявіцца адказ на запыт у выглядзе:

ЗапісN FAM ADR
5 Пятроў І.П Калінoўскага, 53-78

Парадак палёў для адлюстравання таксама можа быць адвольным.

5.3. Пошук інфармацыі па запыту. Састаўныя ўмовы

Часта здараецца, што для атрымання неабходнай інфармацыі з базы даных патрабуецца сфармуляваць умовы, якія змяшчаюць дзве або тры простыя ўмовы. Напрыклад, патрабуецца даведацца, якія выданні будуць прыходзіць падпісчыкам увесь чацвёрты квартал. Умовы пошуку павінны мець дзве простыя ўмовы: першая — TN < = 10, другая — TK = 12.

Умовы, якія змяшчаюць некалькі простых умоў называюцца састаўнымі. У дадзеным выпадку састаўныя ўмовы запішуцца ў выглядзе:

TN < = 10 .AND. TK = 12

Службовае слова .AND. (і) звязвае дзве простыя ўмовы ў адну састаўную. Каб такая састаўная ўмова па службовым словам .AND. выконвалася, павінны адначасова выконвацца дзве простыя ўмовы.

У дадзеным прыкладзе няма неабходнасці выводзіць на экран поўныя запісы базы даных, таму выведзем на экран толькі інфармацыю поля NAZ. Запыт прыме выгляд:

LIST NAZ FOR TN < = 10 AND. TK = 12
Чытаецца: [ліст] NAZ [фо] TN < = 10 [энд] TK = 12
Абазначае: перагартаць NAZ для TN < = 10 і TK = 12

На экране адлюструецца адказ на запыт у выглядзе:

1 Знамя юности
4 Настаўніцкая газета
7 Народная газета

СКБД дазваляе выкарыстоўваць і іншыя службовыя словы для стварэння састаўных умоў. Пры запісу састаўных умоў можна карыстацца круглымі дужкамі.

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. У як

СТАРОНКІ НОВЫХ ПАДРУЧНІКАЎ

Сусветная гісторыя

10 КЛАС

§ 9. КУЛЬТУРА СТАРАЖЫТНАГА ЎСХОДУ

Вытокі сучаснай еўрапейскай культуры ў значнай меры бяруць пачатак ад антычнасці. У сваю чаргу культура старажытных грэкаў і рымлян успрыняла многія важныя дасягненні больш старажытных цывілізацый Месапатаміі, Егіпта і суседніх краін.

Цывілізацыі Індыі і Кітая ўзніклі пераважна ў адрыве і незалежна ад культур Пярэдняй Азіі. Але яны, валодаючы многімі значнымі ўласнымі дасягненнямі, распаўсюдзілі свой культурны ўплыў на краіны большай часткі Азіі.

Значны прагрэс культуры ў гісторыі чалавецтва настаў з узнікненнем вырабляючай гаспадаркі і пераходам да аселага спосабу жыцця. З гэтага часу пачалі будаваць жыллё для шматгадовага карыстання. З гэтага пачынаецца гісторыя архітэктуры. Адкрываецца матчымасць рабіць даволі цяжкі, але вельмі патрэбны земляробам керамічны і каменны посуд. Гэта спрыяла развіццю мастацтва.

Земляробства — дастаткова складаны занятак. Ворыва палёў, сяўбу, догляд за пасевамі трэба рабіць у пэўны тэрмін. Гэта вызначыла ўзнікненне календароў. Неабходнасць уліку сельскагаспадарчай прадукцыі, вымярэння палёў і іншыя разлікі прывялі да пачаткаў матэматыкі і з'яўлення старажытнейшай пісьменнасці.

Узнікненне і развіццё пісьма. Калі мова ўзвысіла чалавека над прадстаўнікамі жывёльнага свету, то пісьменнасць раз і назаўсёды вывела яго з першабытнага стану. Першыя сістэмы пісьма пачалі стварацца ў краінах Старажытнага Усходу ў апошнія шэсць тысяч гадоў. Старажытнейшыя пісьмовыя помнікі знойдзены ў паўднёвым Міжрэччы. Большасць вучоных мяркуе, што іх стваральнікамі з'яўляюцца шумеры. Асобныя пісьмовыя знакі мелі выгляд жывёл, птушак, рыб, гор, зорак, чалавека і частак яго цела і г. д. У далейшым развіцці знакі-малюнкі ператварыліся ў такія пісьмовыя знакі, сэнс якіх не адпавядаў малюнку. Так відарыс ног азначаў усе дзеянні, звязаныя з нагамі: "хадзіць", "стаяць" і нават "насіць".

Потым асобныя знакі атрымалі гукавы сэнс. Напрыклад, знак-малюнак жбана для малака атрымаў гучанне назвы малака — "га". Такім чынам утварылася некалькі соцен складоў, з якіх на пісьме складаліся асобныя словы.

З самага пачатку асноўным матэрыялам для пісьма ў Месапатаміі зрабіліся гліняныя пліткі, ці таблічкі. З часам знакі-малюнкі спрашчаліся, іх размяшчалі ў рады прамых ліній. Потым пісары пераставалі маляваць, а пачалі ўціскаць ў сырую гліну ніжні канец трысняговай палачкі, завостраны ў форме маленькага трохвугольніка. Атрымоўваліся значкі, падобныя на клінЫ. Так узнік клінапіс. У сваім развіцці ён прайшоў шлях ад малюнкаў-прадметаў да складовага пісьма.

Нягледзячы на соваю грувасткасць і нязручнасці матэрыял для пісьма — гліну, клінапіс распаўсюдзіўся ў многіх краінах Пярэдняй Азіі. Яго прыстасавалі для пісьма на розных мовах і ён выйшаў з ужывання толькі ў першыя стагоддзі нашай эры.

І егіпецкая пісьменнасць бярэ пачатак ад маляванага пісьма. Характар егіпецкага пісьма не адрозніваецца ад клінапісу. Егіпцяне пісалі на камені і папірусе, якім шырока карысталіся ў антычнасці і ў сярэднявечнай Еўропе да VIII ст.

Егіпцяне зрабілі важнае адкрыццё ў гісторыі пісьма. Яны ўвялі ва ўжытак некалькі знакаў-літар, абазначаўшых зычныя гукі. Гэта паскорыла ўтварэнне алфавітных сістэм пісьма. Першыя алфавіты складаліся толькі з зычных літар. У іх ліку быў і фінікійскі алфавіт, потым запазычаны грэкамі. На аснове грэчаскага алфавіта створана і наша пісьмо.

Старажытныя індусы таксама стварылі алфавітную пісьменнасць, якой шырока карысталіся ў краінах Паўднёва-Заходняй Азіі. Кітайская іерагліфічная пісьменнасць склалася ў II тыс. да н. э. Яна ў амаль нязменным стане захавалася да нашых дзён. У I ст. да н. э. кітайцы навучыліся рабіць паперу з адыходаў шаўкапрада і анучаў.

Асаблівасці старажытных усходніх літаратур. Доўгі час пісьменнасць абслугоўвала пераважна гаспадарчыя інтарэсы. Амаль ва ўсіх буйных цывілізацыях першымі з літаратурных твораў былі запісаны міфы. Гэта сюжэты аб стварэнні свету і чалавека, узнікненні асноўных заняткаў чалавека: земляробства, рамяства, пісьменнасці і інш.

Часамі сустракаюцца надзіва падобныя міфы народаў, якія жылі на вялікай адлегласці адзін ад аднаго. Так ўяўленне аб утварэнні свету з першабытнага хаосу адлюстравана ў міфах Месапатаміі, Егіпта, Ірана, Кітая. Міфы аб стварэнні чалавека з гліны багамі (ці богам) засведчаны ў Месапатаміі, у старажытных яўрэяў і кітайцаў. У Месапатаміі, Іране, Індыі і Кітаі існавалі блізкія нават у дэталях міфы аб сусветным патопе. Былі надзвычай распаўсюджаны міфы аб паміраючых і ўваскрасаючых багах расліннасці.

З. удасканаленнем літаратурных прыёмаў павялічыўся і лік твораў самых разнастайных жанраў. Гэта і эпічныя паэмы, казкі і легенды, аповесці, павучанні, гімны багам, прароцтвы, любоўная лірыка і г. д.

Многія цывілізацыі Старажытнага Усходу пакінулі літаратурныя творы, якія сталі шэдэўрамі сусветнай літаратуры. Гэта месапатамскі "Эпас пра Гільгамеша", егіпецкая лірыка, казка "Аповесць пра Сінухета", літаратурныя кнігі Бібліі, індыйскія "Веды", паэмы "Махабхарата" і "Рамаяна", драматургія Калідасы, філасофская проза Кітая.

Сюжэты баек, якія прыпісваюць грэку Эзопу, былі запісаны ў Егіпце і Месапатаміі ў III—II тыс. да н. э. У многіх старажытных усходніх народаў былі запісы прыказак і прымавак.

Ужо ў гэты старажытны час была ўсвядомлена роля паэта ў грамадстве. Агульнавядома, што А. С. Пушкін напісаў на гэту тэму верш "Я помнік сабе ўзвёў нерукатворны..." Гэта назва ўзята з верша рымскага паэта Гарацыя, які жыў за 18 стагоддзяў да Пушкіна.

Ужо ў наш час стала вядома, што Гарацый ведаў радкі з верша невядомага егіпецкага паэта II тыс. да н. э.:

Создан памятник мною.
Он вековечное
Меди и пирамид выше
он царственных.

(Пераклад Г. Ахматавай.)

Архітэктура і выяўленчае мастацтва. Своеасаблівасць і непаўторнасць культуры кожнай старажытнай усходняй цывілізацыі асабліва наглядна выявіліся ў архітэктуры і мастацтве. У старажытны час на Усходзе творчасць архітэктараў, скульптараў і мастакоў была падпарадкавана інтарэсам дзяржавы і рэлігіі. Лепш за ўсё гэта выявілася ў Егіпце, дзе фараон валодаў усёй паўнатой улады, а жрэцтва складала пануючы пласт грамадства.

Нідзе ў свеце не ствараліся такія велізарныя збудаванні, якімі з'яўляюцца егіпецкія пірамІды. Не менш грандыёзныя грабніцы, высечаныя ў скальных пародах. Падчас ім нададзены выгляд наземных палацаў з сотнямі памяшканняў, а грабніца фараона Сеці I (Новае царства) паглыбляецца ў горную пароду амаль на 100 м.

Не менш унушальныя і егіпецкія храмы. Так у Карнакскім храме ў Фівах пастаўлены 2 абеліскі вышынёй у 30 м і вагой каля 100 т кожны. 12 цэнтральных калон маюць вышыню 21 м, на подыум кожнай з іх адначасова маглі стаць 100 чалавек. У новы час у патайным месцы ў Карнаку было знойдзена 500 каменных і больш як 17 тыс. бронзавых скульптур і статуэтак.

Былі ў Егіпце і скальныя храмы, самы вядомы з іх размешчаны на беразе Асуанскага вадасховішча. Каля яго ўвахода пастаўлены чатыры каласальныя скульптуры фараона Рамзеса II у сядзячым стане вышынёй у 20 м.

У эпоху Сярэдняга царства быў пабудаваны памінальны храм фараона Аменемхета III. Гэта збудаванне было вядома ў грэкаў як Лабірынт. Па сведчанню Герадота, ён сваімі памерамі перавышаў нават піраміды. Сапраўды, ён займаў плошчу ў 72 тыс. кв. м, а піраміда Хеопса — толькі 54 тыс. кв. м.

У Месапатаміі самымі вялікімі збудаваннямі былі ступеньчатыя храмы (зікураты). Храм галоўнага бога Вавілона Мардука, які стаў прабразам біблейскай вавілонскай вежы, меў у вышыню каля 90 м.

Вялікае ўражанне на іншаземцаў выклікала раскоша і дасканаласць планіроўкі гарадоў Ніневіі і Вавілона. Колькасць жыхароў у іх даходзіла да некалькіх сот тысяч.

Рэформа Эхнатона выклікала ўсплеск рэалістычных тэндэнцый у мастацтве. Былі створаны такія шэдэўры міравога мастацтва, як скульптурныя партрэты Неферціці і Эхнатона, рэльефы з відарысам іх мнагадзетнай сям'і ў натуральнай бытавой абстаноўцы.

Жывапісныя творы егіпцян захаваліся на сценах грабніц і памінальных храмаў, якія падчас называюць карціннымі галерэямі для мёртвых. Уражвае разнастайнасць іх сюжэтаў. Тут падрабязна паказаны сельскагаспадарчыя работы, рамесныя майстэрні, бытавыя сцэны, ілюстрацыі да тэкстаў біяграфій пахаваных асоб, пейзажы, сцэны палявання і многае іншае.

Старажытны індыйскі жывапіс больш за ўсё вядомы па фрэсках Аджанты (Заходняя Індыя), пячорных храмы якой ствараліся на працягу тысячы гадоў. Роспісы выкананы на будыйскія тэмы.

У 1974 г. у паўночным Кітаі была знойдзена велізарная грабніца будаўніка Вялікай сцяны імператара Цінь Шыхуанды. У ёй знойдзена больш як 3000 скульптур пехацінцаў і коннікаў з партрэтнымі рысамі твару.

Навука. Старажытныя ўсходнія цывілізацыі дасягнулі значных поспехаў у матэматыцы, астраноміі, медыцыне. У галіне матэматыкі егіпцяне стварылі сістэму лічэння, блізкую да дзесяцярычнай, мелі ўяўленне аб дробах. Кітайцы пакінулі трактат "Матэматыка ў дзевяці кнігах" (II ст. да н. э.), дзе сабраны правілы дзеянняў з дробамі, прапорцыі і прагрэсіі, рашэнні сістэмы лінейных ураўненняў і г. д. Выдатным дасягненнем індыйскай матэматыкі з'яўляецца стварэнне дзесяцярычнай сістэмы лічэння з увядзеннем паняцця "нуль". Тое, што мы называем арабскімі лічбамі, таксама з'яўляецца індускім адкрыццём. Яны ўвялі ў навуку паняцці "цифра", "синус", "косинус". Алгебраічныя веды індусаў пры дапамозе арабаў сталі здабыткам чалавецтва.

У астраноміі егіпцяне склалі карту зорнага неба і каталог зорак. Вавіланяне, вывучаючы зікураты як абсерваторыі, устанавілі перыядычнасць руху нябесных цел, паставілі астраномію на матэматычную аснову, пакінуўшы мноства астранамічных табліц. Вавілонія дасягнула такога ўзроўню ў развіцці астраноміі, які адпавядаў еўрапейскаму эпохі Адраджэння. У некалькіх вавілонскіх гарадах узніклі самастойныя навуковыя астранамічныя школы. Пры вызначэнні вавіланянамі працягласці сонечнага года памылка склала ўсяго 7 мінут.

У сярэдніх вякі лічылі, што адкрыцці індусаў у астраноміі "больш дасціпныя", чым у вавіланян і грэкаў.

Вялікія дасягненні народаў Старажытнага Усходу ў медыцыне. Рана былі напісаны медыцынскія працы і дапаможнікі. Вядома 10 егіпецкіх папірусаў, з якіх сваім энцыклапедызмам вылучаюцца папірусы Эберса і Рында. У Вавілоніі ў II тыс. да н. э. створаны выдатны медыцынскі твор на 40 клінапісных таблічках, які складаецца з пяці частак.

У Індыі адна з Вед, "Аюрведа", даслоўны пераклад "Навука пра даўгалецце", мае прамое дачыненне да медыцыны. Захаваліся вялікія медыцынскія трактаты, якія мелі падчас ад 150 да 184 раздзелаў. Індусы першымі звярнулі ўвагу на спадчынную прыроду захворванняў, іх залежнасць ад наваколь нага асяроддзя. У Індыі, у адрозненне ад іншых краін старажытнасці, выключаючы Егіпет, дазвалялася анатамізаваць і даследаваць целы памёршых.

Нядаўна ў Кітаі археолагі знайшлі рукапісы медыцынскіх твораў II ст. да н. э. па дыеталогіі, лячэбнай гімнастыцы і інш.

Кожная цывілізацыя ўнесла свой уклад у медыцыну. Для Егіпта характэрна вузкая спецыялізацыя ўрачоў і рацыянальная медыцынская этыка. Яны мелі ўяўленні аб крывяносных сасудах, ролі сэрца і мозга.

Шумерскім сімвалам бога здароўя з'яўляліся дзве змяі, што абвівалі жазло. Гэта вельмі падобна на сучасную эмблему медыцыны. Індусы былі заснавальнікамі дыеталогіі. Яны дасягнулі і іншых поспехаў, якія захаваны ў тыбецкай медыцыне. Старажытныя кітайцы ведалі іголкаўколванне і выкарыстоўвалі анестэзію пры аперацыях.

Народы Старажытнага Усходу стварылі багатую культуру, якая аказала значны ўплыў на развіццё сусветнай цывілізацыі.

1. Якія дасягненні ў галіне матэрыяльнай вытворчасці паскорылі культурны прагрэс чалавецтва? 2. У якіх краінах свету былі створаны першыя алфавіты? 3. У чым выявіліся своеасаблівасці культурнага развіцця індыйскай і кітайскай цывілізацый? 4. Якія народы Старажытнага Усходу зрабілі большы ўклад у развіццё медыцыны?

Аўт. ДАЎГЯЛА Г. І.

ЦІКАЎНЫМ

ПАДАРОЖЖА Ў ПАСЫЛЦЫ

Вельмі "арыгінальны" эксперымент правяла 22-гадовая студэнтка Хуста Сурбіэр з горада Гронінген (Галандыя). З дапамогай сяброўкі яна "ўпакавалася" ў кардонную скрынку, пакрытую знутры пенапластам. Пасля гэтага незвычайная пасылка была адпраўлена поштай у другі горад на адрас маці Хусты. Даставука пасылкі каштавала ўсяго 5 гульдэнаў. А акуратнае выкананне паштовымі служачымі паметак тыпу "Верх", "Асцярожна, шкло!" і "Не кантаваць!" дазволіла студэнтцы зрабіць такое незвычайнае падарожжа без усякіх ускладненняў.

НАСЕЛЬНІЦТВА ЗЯМЛІ

Да канца гэтага стагоддзя тэмпы прыросту насельніцтва свету, агульная колькасць якога ў цяперашні час дасягнула 5,2 мільярда, будуць расці і перавысяць 90 мільёнаў у год. Прычым пераважная большасць з іх будзе прыпадаць на краіны, якія развіваюцца. Да канца гэтага стагоддзя агульная колькасць насельніцтва свету дасягне 6,25 мільярда чалавек, а да 2025 года — прыкладна 8,5 мільярда. Магчыма, праз сто гадоў рост насельніцтва спыніцца, дасягнуўшы адзнакі ў 10 мільярдаў. Гэтыя лічбы прыведзены ў дакладзе ААН, прысвечаным сусветнаму дэмаграфічнаму становішчу.

Калі краінам, што развіваюцца, не ўдасца да 2025 года ажыццявіць праграмы планавання сям'і, якія дзейнічаюць цяпер у развітых краінах, то колькасць насельніцтва планеты праз сто гадоў можа дасягнуць 14 мільярдаў.

А КРАСОВАК ШКАДА...

Самы выслівы бягун на свеце, напэўна, нью-йоркскі афіцыянт Т. Кейв. Пабіўшыся аб заклад на буйную суму, з перапынкамі толькі на яду і сон, ён прабег праз пяцьдзесят амерыканскіх штатаў, пераадолеўшы ў агульнай складанасці 14 тысяч кіламетраў. Гэты своеасаблівы рэкорд даўся Кейву нялёгка. У дарозе ён страціў у вазе звыш дзесяці кілаграмаў, не лічачы некалькіх пар стаптаных красовак...

ФОРМУЛА СПАКОЮ

Англійскі псіхолаг Джон Кінг апублікаваў вынікі сваіх даследаванняў, што датычыцца лячэння розных відаў неўрозаў. Па распрацаванай ім методыцы лячэнне такіх захворванняў вельмі простае і не патрабуе лекаў. Дастаткова толькі гадзіну-другую на працягу дня паслухаць шум марскога прыбою, глыбока ўдыхаючы пры гэтым пахі мора. Спецыялісты праверылі методыку доктара Кінга і прыйшлі да высновы, што гэта сапраўды эфектыўны спосаб лячэння нервовых расстройстваў.

ЦІ СТАНЕ ГЛУШАК ХАТНІМ?

Непадалёку ад паселішча Сваньой у заходняй частцы Нарвегіі пад кіраўніцтвам прафесара Скервольда праводзяцца вельмі цікавыя доследы па адамашніванню дзікіх качак, гусей, лебедзяў. Асабліва цікавыя падобныя спробы ў адносінах глушца. Вялікая перавага гэтай птушкі ў тым, як лічаць вучоныя, што яна харчуецца грубай ежай. Куранты, якія з'яўляюцца на свет у чэрвені, ужо ў верасні важаць тры з паловай кілаграмы і гатовы да таксавання. Апрача таго, звыклых да холаду глушцоў можна круглы год трымаць у клетках на адкрытым паветры.

САЛОН ... ШУМУ

Салон... шуму адкрыўся ў Парыжы. Тут можна паслухаць запісы ўсялякіх гукаў — ад спеваў салаўя да... рову рухавіка міжпланетнага карабля. Дададзім, што ў некаторых залах салона наведвальнікі не могуць знаходзіцца без затычак у вушах.

НАПАЛОХАЛА ЗАПІСКА

Усе службы каірскага аэрапорта былі ўзняты па трывозе. Прычынай стала запіска на невядомай мове, знойдзеная ў самалёце саудаўскай авіякампаніі. Улады, напалоханыя ростам тэрарызму, думалі пра самае горшае. Трыста пяцьдзесят пасажыраў падвергнуліся страннай праверцы, багаж таксама, але бомбу або зброю не знайшлі. Паліглоты засеялі за расшыфроўку запіскі, але іх спробы аказаліся дарэмнымі. Нарэшце хтосьці ўспомніў, што да гэтага самалёт лятаў на Філіпіны. Дастаўлены перакладчык паведаміў, што ў запісцы змяшчаецца просьба жонкі да мужа не забыць зрабіць патрэбныя пакупкі.

АСЦЕРАГАЙСЯ... ШКЛА

У штаце Пенсільванія дзейнічае закон, згодна з якім на ўсіх шкляных дзвярах на ўзроўні вачэй чалавека павінны быць вывешаны... яркія знакі. Такое рашэнне было выклікана да жыцця сумным выпадкам. Калісьці губернатар штата, задумаўшыся, урэзаўся галавой у шкляныя дзверы аднаго рэстарана і атрымаў сур'ёзныя парэзы.

ДЭМАКРАТЫЯ ПА-ЯПОНСКУ

Свабода веравызнання ў Японіі гарантуецца канстытуцыяй. "Ні адна рэлігійная арганізацыя не павінна атрымліваць якіх-небудзь прывілей ад дзяржавы, а роўна карыстацца палітычнай уладай. Ніхто не можа быць прымушаны прымаць удзел у якіх-небудзь рэлігійных актах, святкаваннях, рытуалах або цырымоніях. Дзяржава і яе органы павінны ўстрымлівацца ад рэлігійнай адукацыі і іншых формаў рэлігійнай дзейнасці", — гаворыцца ў артыкуле 20 японскай Канстытуцыі.

Дамінуючая рэлігія сённяшняй Японіі — будызм. Шырока распаўсюджана хрысціянства. Сярод іншых рэлігій у першую чаргу трэба назваць іслам.

Але спрадвеку нацыянальная рэлігія японцаў — сінтаізм, які ўходзіць каранямі ў анімістычныя вераванні старажытных японцаў. Сінтаізм паступова ператварыўся ў абшчынную рэлігію — у кожным раёне свае саяшчэнныя месцы і свае богі-захавальнікі. З пакалення ў пакаленне людзі абагаўлялі герояў і выдатных кіраўнікоў сваіх абшчын. Сінтаізм мірна суіснуе, а часам і спалучаецца з будызмам. Напрыклад, шлюбы сёння вядуцца згодна з сінтаісцкім абрадам, а нахаванне праходзіць па будыйскаму рытуалу.

КРЫТЭРЫЙ АЦЭНКІ — СПАЖЫВАННЕ ПІВА

У Гамбургу праведзена займальнае даследаванне. У меру пітушчым лічыцца той чалавек, які штодзённа выпівае не больш як чатыры з паловай шклянкі піва (зыходзячы з таго, што адна шклянка — 0,2 літра піва — утрымлівае 8 грамаў чыстага алкаголю. Гэта адпавядае аднаму куфлю белага віна — 0,1 літра або 0,02 літра гарэлкі), а ў святы — не болей як 15 шклянак.

Шматпітушчы штодзённа ўжывае ад сямі да васьмі шклянак, у асаблівых выпадках — да 25 шклянак піва.

Тых, хто пры ўжыванні алкагольных напіткаў перавышае дадзеную норму, адносяць да "праблемных п'яніц", паколькі такія дозы ўжо ствараюць праблемы як у сям'і пітушчага, так і на яго рабоце.

Чалавек, які штодзённа выпівае 14 шклянак піва (каля 100 у тыдзень), належыць да катэгорыі амаль алкаголікаў. Ён ужо не ў сілах утаіць ад іншых сваю цягу да спіртнога. З вялікай доляй верагоднасці можна сказаць, што такі чалавек стане алкаголікам, калі не абмяжуе ўжыванне спіртнога.

Алкаголік ужывае штодзённа столькі алкаголю, колькі ўтрымліваецца ў 20 шклянках піва і больш. Пры ўжыванні спіртнога ён страчвае кантроль над сабой і не ў стане абысціся без выпіўкі нават кароткі час.

КОНІК У СМЯТАНЕ — НЯМА НІЧОГА СМАЧНЕЙ?

У выніку даследавання праблем харчавання французскі спецыяліст Б.Комбі прыйшоў да заключэння: "Усё чалавецтва павінна ўжываць у ежу насякомых". Паводле яго слоў, гэты найкаштоўнейшы прадукт харчавання выкарыстоўваецца яўна недастаткова. "На нашай планеце мільярд чалавек пакутуе ад недахопу бялку. А насякомыя ж — кладоўка высакаякаснага біялагічнага бялку!" Трэба падкрэсліць, што народы, якія ў найбольшай ступені адчуваюць недахоп бялку, жывуць якраз у раёнах, што падвяргаюцца нашэсцю саранчы. Паводле слоў спецыяліста, які сам ахвотна есць насякомых, ужыванне іх у ежу можа вырашыць праблему голаду ў свеце. Да таго ж насякомыя — не толькі каштоўны пажыўны прадукт, гэта проста смачна: "Конік на смаку нагадвае эскалоп у смятане, кукалка матылька — амлет!"

Магчыма пан Комбі і мае рацыю, але наўрад ці хто з жыхароў Беларусі, у тым ліку і педагогі, захоча ўзяць з яго прыклад. Нягледзячы на нашу жабрацкую зарплату...

ШТО ПРАПАНУЕ ТЭЛЕЭКРАН

СЕРАДА, 28 ВЕРАСНЯ

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

8.00 Раніца рэспублікі. 8.10 Эканамікст. 8.20 Пад купалам Сусвету. 8.30 Надвор'е. 8.40 Пяць хвілін на жарты. 8.50 "Дзівосны манеж". Мультфільм. 9.00 Тэлебачанне — школе. Гісторыя. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Баі на тэрыторыі Беларусі. 9.30 "Маё каханне, мой смутак". Тэлесерыял. 10.30 Аэробіка. 12.10 Валадарская дружына. Вялікае княства Літоўскае. 13.10 Студыя "Бімбат" прадстаўляе: "Крылы". Відэафільм. 13.30 Навіны. 15.40 Відзьма-навідзьма. Навіны кіна-відэа-аўдыё. 16.40 "Еўрапейскі калейдаскоп". 17.10 "Бімбат". Праграма для падлеткаў. У студыі міжнародны гросмайстар К.А.Зварыкіна. Прамая лінія. 17.30 "Напярэдадні". Да 50-годдзя Лідскага кабмініата харчовых канцэнтратаў. 17.50 Футбол. Кубак УЕФА. "Лацыо" (Італія) — "Дынама" (Мінск). Пасляслоўе да матча. 18.10 Абласныя навіны (Гомель). 18.25 Навіны Бі-бі-сі. 19.00 "Крок". "Пяць зорак". Тэлегульня. 20.10 Крэда. Праграма для дзелавых людзей. 20.30 Кантакт: адрасы, прапановы, інфармацыя. 20.35 Калыханка. 21.00 Панарама. 21.35 Пяць хвілін на жарты. 21.40 Пад купалам Сусвету. 21.50 Надвор'е. 22.00 На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — "Маё каханне, мой смутак". Тэлесерыял. Хакей. Чэмпіянат МХЛ.

КАНАЛ "АСТАНКІНА"

5.30 Раніца. 7.00, 9.50, 15.00, 17.00, 20.00, 23.00 Навіны. 7.15 Працяг праграмы "Раніца". 8.00 Расійскі дайджэст. 8.20 "Дзікая Роза". Тэлесерыял. 8.45 Дзелавы веснік. 8.55 Клуб падарожнікаў. 15.25 "Вайна гобатаў". Мультсерыял. 15.50 На балі ў Папялушкі. 16.05 "Лятаючы дом". Мультсерыял. 16.40 Міждзяржаўная тэлерадыёкампанія "Мір". 17.25 Азбука ўласніка. 17.40 Свет сёння. 17.50, 20.35 Надвор'е. 18.00 Гадзіна пік. 18.25 "Дзікая Роза". Тэлесерыял. 18.55 Клуб "Белы папугай". 19.40 Добрай ночы, малышы! 20.45 Маналог. 20.55 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. 23.10 Праграма "У". 23.30 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Агляд. 0.40 Прэс-экспрэс.

КАНАЛ "РАСІЯ"

6.00, 11.00, 15.00, 19.00, 22.00 Весткі. 6.20 Патрабуюцца... патрабуюцца... 6.30 Формула-730. 7.00 Час дзелавых людзей. 7.30 Снедание для чэмпіёнаў. 8.00 Сусветныя навіны Эй-бі-сі. 8.25 Ранішні канцэрт. 8.40 "Санта-Барбара". Мастацкі фільм. 9.30 Рэпарцёр. 9.45 XX стагоддзе ў кадры і па-за кадрам. 10.35 Тэлегазета. 10.40 Сялянскае пытанне. 15.20 Студыя "Рост". 15.50 Там-там навіны. 16.05 Далёкі Усход. 16.50 Кліп-антракт. М.Оліна. 16.55 М-трэст. 17.10 Залатая галінка. "Манастыры Наўгародчыны". 17.40 Свята кожны дзень. 17.55 Звычайная справа. 18.10 Тэледэбаты. 19.25 Падрабязнасці. 19.35 "Санта-Барбара". Мастацкі фільм. 20.25 Ніхто не забыты. 20.30 Гранд-рэпартаж "Цыганская рапсодыя". 21.05 Зала чакання. "Прызначанае банкрутства". 22.20 Аўтаімгненне. 22.25 Зоркі гавораць. 22.30 Спартыўная карусель. 22.35 Пецярбургскія сезоны.

ЧАЦВЕР, 29 ВЕРАСНЯ

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

8.00 Раніца рэспублікі. 8.10 Пад купалам Сусвету. 8.20 Надвор'е. 8.30 Пяць хвілін на жарты. 8.40 Крэда. Праграма для дзелавых людзей. 9.00 "Маё каханне, мой смутак". Тэлесерыял. 12.25 Трэці тайм. Футбольны агляд. 13.10 "Бімбат". Праграма для падлеткаў. У студыі — міжнародны гросмайстар К.А.Зварыкіна. 13.30 Навіны. 16.40 Тэлебачанне — школе. Беларуская літаратура. Еўфрасіння Полацкая і яе жыццё. 17.10 "Бімбат". Праграма для падлеткаў. "Марсельеза". 17.30 "Кутх і мышы". Мультфільм. 17.40 Планета людзей. Па матэрыялах тэлеканала "Уорлднер" (ЗША). 18.10 Абласныя навіны (Гродна). 18.25 Навіны Бі-бі-сі. 19.00 Зачытайце маё пісьмо... 19.05 Стоп-кадр. Крымінальная хроніка. 19.25 1000 пытанняў. 20.00 Партрэт на фоне часу. Акцыянернае таварыства "Віцебскі панчошна-трыкатажны камбінат КІМ". 20.30 Кантакт: адрасы, прапановы, інфармацыя. 20.35 Калыханка. 21.00 Панарама. 21.35 "Крок". "Залатая дзесятка". Прамая лінія. 22.55 На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — Пяць хвілін на жарты. Пад купалам Сусвету. Надвор'е.

КАНАЛ "АСТАНКІНА"

5.30 Раніца. 7.00, 9.50, 15.00, 17.00, 20.00, 23.35 Навіны. 7.15 Працяг праграмы "Раніца". 8.00 Агляд рынку нерухомасці. 8.20 "Дзікая Роза". Тэлесерыял. 8.45 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. 15.25 "Вайна гобатаў". Мультсерыял. 15.50 Мульцітролія. 16.05 ...Да 16 і старэйшым. 16.40 Планета. "Агульны дом СНД: ідэалы і практыка". 17.25 Знак пытання. 17.40 Загадка СБ. 17.50, 20.30 Надвор'е. 18.00 Гадзіна пік. 18.25 "Дзікая Роза". Тэлесерыял. 18.55 Сярэбраны шар. 19.40 Добрай ночы, малышы! 20.40 Масква—Крэмль. 21.00 Лато "Мільён". 21.30 Мастацкі фільм з удзелам Алена Дзлона "На яркім сонцы" (Францыя). 23.45 Прэс-экспрэс.

КАНАЛ "РАСІЯ"

6.00, 11.00, 15.00, 19.00, 22.00 Весткі. 6.20 Патрабуюцца... патрабуюцца... 6.30 Формула-730. 7.00 Час дзелавых людзей. 7.30 Знаёмыя мелодыі. 8.00 Сусветныя навіны Эй-бі-сі. 8.30 Паехалі. 8.40 "Санта-Барбара". Мастацкі фільм. 9.35 Зусім сакрэтна. 10.30 Тэлегазета. 10.40 Сялянскае пытанне. 15.20 Студыя "Рост". 15.50 Там-там навіны. 16.05 Новая лінія. "Вострыў". 16.35 На шляху да рынку. 16.50 Рубяжы. 17.05 Будні. 17.45 Свята кожны дзень. 17.55 У свеце аўта- і мотаспорту. 18.25 Свая гульня. 19.25 Падрабязнасці. 19.35 "Санта-Барбара". Мастацкі фільм. 20.30 Я — лідэр. 20.55 Ціхі дом. 21.45 Экран крымінальных паведамленняў. 22.20 Аўтаімгненне. 22.25 Зоркі гавораць. 22.30 Спартыўная карусель. 22.35 Футбол. Кубак кубкаў.

ПЯТНІЦА, 30 ВЕРАСНЯ

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

8.00 Раніца рэспублікі. 8.10 Пад купалам Сусвету. 8.20 Надвор'е. 8.30 Пяць хвілін на жарты. 8.40 Як нараджаецца музыка? "Слухаем клавесін". 9.00 Тэлебачанне — школе. Беларуская літаратура. Еўфрасіння Полацкая і яе жыццё. 9.30 Гуляем у стрытбол. Спартыўная праграма. 10.00 Творчае маладзёжнае аб'яднанне "Крок". "Пяць зорак". Тэлегульня. 11.10 "Я+Я". Мужчына і жанчына. 11.45 Планета людзей. Па матэрыялах тэлеканала "Уорлднет" (ЗША). 12.15 Размовы ад Вовы. 12.45 "Дывертысмент". Фільм-канцэрт. 13.10 "Бімбат". Праграма для падлеткаў. "Марсельеза". 13.30 Навіны. 16.30 Жыві і помні. "Трасцянец" — наш боль. 17.10 "Бімбат". Праграма для падлеткаў. Закон і ты. Прамая лінія. 17.40 У свеце навукі. Якую ваду мы п'ём? 18.10 Абласныя навіны (Магілёў). 18.25 Навіны Бі-бі-сі. 19.00 Эканамікст. 19.10 Свята песіі ў Нясвіжы. 19.35 "Свая ці чужая выгада?" Погляд на прыватызацыю дзяржаўнай маёмасці. 20.20 Студыя "Тэлесябрына". Падарункі на добры настрой. 20.35 Кантакт: адрасы, прапановы, інфармацыя. 20.40 Калыханка. 21.00 Панарама. 21.35 Пяць хвілін на жарты. 21.40 Пад купалам Сусвету. 21.50 Надвор'е. 22.00 На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння. "Таміра" прапануе: "Доўгія провады". Мастацкі фільм.

КАНАЛ "АСТАНКІНА"

5.30 Раніца. 7.00, 9.50, 15.00, 17.00, 20.00, 23.00 Навіны. 7.15 Працяг праграмы "Раніца". 8.00 Новы старт. 8.15 Сарока. 8.40 "Дзікая Роза". Тэлесерыял. 9.10 "Лідзія Скоблікава". Аўтапартрэт. 10.00 Бізнес-клас. 15.25 У гасцях у казкі. Тэлевізійны мастацкі фільм "Рыжы, сумленны, закаханы". 1-я серыя. 17.25 Чалавек і закон. 17.55, 20.35 Надвор'е. 18.00 Чалавек тыдня. 18.20 "Дзікая Роза". Тэлесерыял. 18.50 Поле цудаў. 19.40 Добрай ночы, малышы! 20.45 Сустрэча з А.І.Салжаніцыным. 21.05 "Вулицы Сан-Францыска". Тэлесерыял. 4-я серыя. 22.05 "Погляд" з А.Любімавым. 23.10 Валейбол. Чэмпіянат свету. 24.00 Прэс-экспрэс.

КАНАЛ "РАСІЯ"

6.20 Патрабуюцца... патрабуюцца... 6.30 Формула-730. 7.00 Час дзелавых людзей. 7.30 "Гарадок". Забаўляльная праграма. 8.00 Сусветныя навіны Эй-бі-сі. 8.25 Паехалі. 8.35 Осіпцаў баль. 9.05 "Санта-Барбара". Мастацкі фільм. 9.55 "Ламінарыя, ці Жыццё з пункту гледжання..." Дакументальны фільм. 10.35 Тэлегазета. 10.40 Сялянскае пытанне. 15.20 Студыя "Рост". 15.50 Там-там навіны. 16.05 Новая лінія. 16.50 Дысней па пятніцах. "Усё яшчэ не чалавек". Мастацкі фільм. 1-я серыя. 17.45 Свята кожны дзень. 17.55 Зорны дождж. 19.25 Падрабязнасці. 19.35 "Санта-Барбара". Мастацкі фільм. 20.25 Пяць хвілін аб добым жыцці. 20.30 Джэнтльмен-шоу. 21.05 "К-2" прадстаўляе: "Спыніся, імгненне". 22.20 Аўтаімгненне. 22.25 Зоркі гавораць. 22.30 Спартыўная карусель. 22.35 "Перамена лёсу". Мастацкі фільм.

СУБОТА, 1 КАСТРЫЧНІКА

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

8.00 Раніца рэспублікі. 8.10 Эканамікст. 8.20 Пад купалам Сусвету. 8.30 Надвор'е. 8.40 Пяць хвілін на жарты. 8.50 Здароўе. Тэлечасопіс. 9.15 "Доўгія провады". Мастацкі фільм. 10.50 Паказвае Віцебск. 11.45 "Лулу — анёл кветак". Мультсерыял. 7-я серыя. 12.20 "Пушчанскія галасы". Тэлеварыяс. 13.00 "Бімбат". Праграма для падлетк